ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



Яна працуе на тэлебачанні, выхоўвае дачку, не так даўно захапілася вырабам лялек. Імпульсіўная ў штодзённым жыцці, скрупулёзная і пунктуальная ў працы Ірына Ханунік-Рамбальская любіць адпачынак, які дазваляе даведацца пра нешта новае. І куды б яна ні трапляла, ёй важна ўбачыць адваротны бок жыцця...

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 кастрычніка 2012 г. ЧАЦВЕР № 197 (27312) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

*ЛІЧБА ДНЯ*

***109 тыс.***

*дзяцей нарадзіліся ў краіне за 2011 год — на 20,6 працэнта больш у параўнанні з 2005 годам. Больш за палавіну (50,9 працэнта) усіх нараджэнняў прыйшлося на першынцаў, 36,9 працэнта дзяцей былі другімі, а 12,2 працэнта — трэцімі і больш. У 2011 годзе ў больш як 1 тысячы жанчын нарадзіліся двайняты і ў 29-ці — трайняты.*

**«Прамая лінія»**

ВЫДЗЯЛЕННЕ ЗЯМЕЛЬНЫХ УЧАСТКАЎ ПАД ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА, ПЫТАННІ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ І РЭГІСТРАЦЫІ МАЁМАСЦІ

12 кастрычніка, у пятніцу, з 12.00 да 13.00 у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Георгія Іванавіча КУЗНЯЦОВА.** Кіраўнік камітэта адкажа на актуальныя пытанні зямельных адносін, ахovы і выкарыстання зямельных рэсурсаў.

**Нумары «прамой лініі»: 8 (017) 292 38 92; 8 (017) 292 38 21. Папярэднія пытанні можна дасылаць на электронны адрас: infp@zvyazda.minsk.by.**

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +9° |
| Віцебск | +8° |
| Гомель | +11° |
| Гродна | +8° |
| Магілёў | +9° |
| Мінск | +9° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.10.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8570,00 ▼ |
| Еўра | 11030,00 ▼ |
| Рас. руб. | 274,50 ▼ |
| Укр. грыўня | 1053,47 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Напярэдадні




Перад матчам з Іспаніяй у продажы з'явіліся адмысловыя шалікі. Іх кошт — 50 тысяч беларускіх рублёў.

Фота Надзеі БУЖАН.

# СТАЦЬ У ГЛУХУЮ АБАРОНУ?

**Гэтага раяць беларускія балельшчыкі айчыннай зборнай у матчы з чэмпіёнамі свету і Еўропы — камандай Іспаніі. Карэспандэнт «Звязды» паразмаўляў з заўзятарамі напярэдадні паядынку, які варта было б наведаць кожнаму.**

Да доўгачаканай сустрэчы з «чырвонай фурыяй» усяго толькі дзень. Час, які, насамрэч, праляцець вокамгненна, і ўжо хутка на стадыён «Дынама» выйдуць іспанцы — зоркі «Барселоны» і «Рэала», прагучаць нацыянальныя гімны, а бельгіец Серж Гумені абвесціць пачатак сустрэчы. Але пры славе саперніка беларусаў ажыятажу напярэдадні гульні няма, а чэргі каля білетных кас пакуль наогул адсутнічаюць.

За трыбунамі мінскага футбольнага «калізея» гуляе асенні вецер. Наведвальнікаў вядомага рынку няшмат. А таму нехта з прадаўцоў грэецца з кубачкам кавы ў руках, іншыя — лупяць у карты адразу на століку, каля якога па тратуары туды-сюды ходзяць нешматлікія пакупнікі. Палаткі са спартыўнай атрыбутыкай балельшчыкі таксама на абардаж не бяруць. Вось і насупраць павільёна Ігара Графа задумліва стаіць толькі адна жанчына і ніяк не можа выбраць футболку для дзіцяці.

— Але зараз зацікаўленасць у майках, балельшчыцкіх шаліках адчуваецца, — кажа Ігар і дэманструе шчыльныя шэрагі рознакаляровых клубных футболак. — Праўда, у асноўным набываюць форму БАТЭ. А вось перад матчам з Іспаніяй у продажы з'явіліся адмысловыя шалікі. Іх кошт — 50 тысяч беларускіх рублёў.

Як лічыць прадпрымальнік, да гульні продаж звычайна ідзе марудна, шалікі пераважна набываюць ужо пасля матчаў. Сарваць добры куш з нашых балельшчыкаў нельга. СТАР. 3

## ЯК ВЫ СТАВІЦЕСЯ ДА ПЕРАХОДУ НА ІНТЭГРАВАНЫЯ ТЭСТЫ ПАДЧАС ЦТ?

**Размова ідзе пра спалучэнне ў адным тэсце рускай і беларускай мовы, гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі і грамадазнаўства, фізікі і матэматыкі, хіміі і біялогіі**



**Людміла ХУХЛЫНДЗІНА, начальнік Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы Белдзяржуніверсітэта:**

— Мэта ўвядзення інтэграваных тэстаў — пашырыць кола спецыяльнасцяў, на якія абітурыенты змогуць падаваць свае дакументы. Логіка простая: чым больш шырокі набор экзаменацыйных дысцыплін у абітурыента на руках — тым больш шырокія ў абітурыента і магчымасці для выбару спецыяльнасці. Аднак тут узнікае шмат пытанняў. З аднаго боку, у Беларусі статус дзяржаўнай маюць дзве мовы — беларуская і руская. Таму інтэграваны тэст па дзвюх дзяржаўных мовах выглядае лагічна. Але моўная сітуацыя ў краіне такая, што нават у школах не рэкамендуецца ставіць у раскладзе побач урокі па рускай і беларускай мовах. Таму, выконваючы заданні тэста, у дзяцей, напэўна, таксама будуць цяжкасці з пераходам ад адной да другой дзяржаўнай мовы. І як у такім разе будуць паступаць у беларускія ВНУ расіяне? Ці беларусы, якія жывуць у замежжы? Не зусім зразумела таксама, як у адным тэсце можна будзе аб'яднаць адразу тры прадметы? Сёння на выкананне тэста па гісторыі адводзіцца 90 хвілін. Няўжо за 90 хвілін можна праэкзаменаваць веды адразу па трох дысцыплінах? Гэта ж велізарнейшы аб'ём падрыхтоўкі!



**Пётр АХРЭМЧЫК, настаўнік беларускай мовы і літаратуры Доўскай гімназіі Рагачоўскага раёна:**

— Тэарэтычна я, як настаўнік беларускай мовы і літаратуры, павінен быць дзвюма рукамі «за» ўвядзенне інтэгραванага тэста па беларускай і рускай мове, бо ў гэтым выпадку матывацыя вывучэння беларускай мовы ў вучняў старэйшых класаў істотна павысілася б. Але рэальна гэта не палепшыць веданне роднай мовы, а толькі створыць дадатковыя цяжкасці для абітурыентаў. Калі ў адным тэсце будуць прадстаўлены заданні і па рускай, і па беларускай мове, то ў дзяцей абавязкова будуць складанасці і з арфаграфіяй, і з арфаэпіяй. Дзе пісаць «е», а дзе «я», дзе пісаць «а», а дзе «о»? І гэтак далей. Сапраўды, статус беларускай мовы трэба ўзнімаць, бо часам стаўленне да яе з боку асобных вучняў ды бацькоў амаль як да замежнай. І гэта вельмі крыўдна. Але ўвядзенне інтэграванага тэста павагу роднай мове не верне. Да таго ж, калі я правільна разумею, здаючы адзін тэст на ЦТ, абітурыент будзе вымушаны, па сутнасці, здаваць адразу два экзамены. Ці не так?



**Ігар ВАРАКСА, намеснік дырэктара Ліцэя БДУ па вучэбнай рабоце:**

— На маю думку, аб'яднанне некалькіх прадметаў ЦТ у адным тэсце не дазволіць дакладна высветліць за адведзены час узровень ведаў абітурыента ні па адным з прадметаў. Калі ж мы будзем дадаваць часу на выкананне тэстаў, то, напэўна, выйдзем за межы санітарных нормаў, таму што ў выпадку фізікі і матэматыкі экзамен можа доўжыцца да 6 гадзін. Ва ўсялякім разе, перад тым як аб'ядноўваць прадметы ў ЦТ, іх трэба нейкім чынам аб'яднаць на ўзроўні вывучэння. Тады, напрыклад, можна было б разглядаць магчымасць увядзення інтэграванага курса гісторыі. Што тычыцца аб'яднання беларускай і рускай мовы, то, з аднаго боку, бачыцца пазітыў, бо кожны абітурыент будзе ведаць абедзве дзяржаўныя мовы, але што рабіць тады з тымі абітурыентамі, якія не вывучалі беларускую мову (замежнікі) і валодаюць толькі рускай? Рабіць для іх асобны тэст? Такім чынам, пасля разважанняў над гэтай прапановай пытанняў застаецца больш, чым адказаў.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «ДЭМАКРАТЫЯ СТАЛА ТОЛЬКІ ШЫРМАЙ ДЛЯ РАСПАЛЬВАННЯ ПАЖАРУ АРАБСКАЙ ДУГІ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што дэмакратыя стала толькі шырмай для распальвання пажару арабскай дугі. Такое меркаванне ён выказаў 9 кастрычніка ў інтэрв'ю брытанскім СМІ: газеце «Індэпендэнт» і тэлеканалу Бі-бі-сі, паведамілі БЕЛТА ў прэсслужбе кіраўніка дзяржавы.**

У час размовы былі зададзены пытанні, якія датычацца розных бакоў жыцця краіны: знешняй і ўнутранай палітыкі, эканомікі, сацыяльнага развіцця дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адказаў таксама на шэраг асабістых пытанняў. Значная ўвага была ўдзелена тэме грамадскага прагрэсу і развіцця дэмакратыі.

У прыватнасці, ацэньваючы падзеі ў Паўночнай Афрыцы і на Блізкім Усходзе, Прэзідэнт адзначыў: «Няпростая была сітуацыя ў гэтых краінах, але не горшая, чым у іншых. Але камусьці спатрэбілася падпаліць гэты пажар арабскай дугі. Я ў першыя ж дні, калі пачаліся гэтыя рэвалюцыі, сказаў, што трэба асудзіць Захад за ўмяшанне, ніхто не мае права ўмешвацца ва ўнутраныя справы дзяржаў, яны самі павінны разабрацца ў сваіх пытаннях. Я тады сказаў, што гэтага ні ў якім выпадку нельга было рабіць і да чаго гэта прывядзе. Толькі-толькі ў Тунісе ўлеглося, на Лівію ўсё перакінулася... Ці тое яшчэ будзе!»

«Сёння мы бачым, да чаго гэта прывяло — успыхнула ўся дуга: з аднаго боку Ірак, і далей ужо на Іран спрабуюць перакінуць, з другога боку Туніс, Алжыр і гэтак далей. І ўсюды вельмі горача. Але дзіўна, што з гэтай дугі былі выключаны дзяржавы, якія падтрымліваюць цесныя адносіны з ЗША, а ў гэтых жа дзяржавах аналагічная сітуацыя. Вас гэта не насцярожвае? — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Я ведаю, чаму гэта адбываецца. Тое, што гэта сцэнарый заакіянскі або замоpскі, і няўзброеным вокам відаць. І пасля таго як сітуацыя пачынала развівацца ў нявыгадным для іх (гэтых сцэнарыстаў) ключы, яны пачалі адкрытыя бамбардзіроўкі. Але пытанне нават не ў гэтым. Навошта гэта было патрэбна? Я тады сказаў, да чаго гэта прывядзе, і гэта здарылася адзін да аднаго. Што, патрэбна была ісламізацыя арабскага Усходу? Патрэбна ім было гэта? Не. Яны і самі сёння не рады, калі яны ўжо разумеюць, што яны рабілі і што яны робяць цяпер».

Прэзідэнт падкрэсліў, што нікому «не патрэбны экспарт рэвалюцыі». «Дык навошта экспартаваць дэмакратыю? У іх разуменні гэтага слова. Дэмакратыя — гэта добра, але ці гатовы народ і ці ёсць умовы для прыняцця такой дэмакратыі ў краіне? Яны ж гэта бачылі, што гэта немагчыма, што гэтыя дзяржавы не гатовы да такога. Ну, якая дэмакратыя сёння ў Іраку, калі там кожны дзень узрываюцца бомбы і сотні людзей гінуць, а яшчэ горш калекамі тысячы застаюцца? А колькі было знішчана? Каму яна патрэбна, такая дэмакратыя?» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Ірак ім трэба было раздзяліць, я гэта добра ведаю, ім нафта патрэбна была. Каму гэта сёння не зразумела? Дэмакратыя — гэта шырма, прыкрыццё гэтага разбойнага працэсу. Адсюль і разглагольстванні аб дэмакратыі. Таму не аб дэмакратыі тут размова», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

У цэлым Прэзідэнт размаўляў амаль чатыры гадзіны і адказаў больш як на 60 пытанняў.

## ■ Парламенцкі дзённік

# БЮДЖЭТ НА 2013 ГОД УХВАЛІЛІ І СЕНАТАРЫ

**Шмат пытанняў было разгледжана ўчора на другім пасяджэнні дзявятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання. Найбольш цікавымі былі законапраекты «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2013 год» і «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь». Як і многія іншыя, гэтыя законапраекты былі ўхвалены сенатарамі.**

На некаторыя пытанні карэспандэнта «Звязды» наконт новага бюджэту (які, нагадаем, зацвярджаецца бездэфіцытным) адказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў Юрый СЕЛІВЕРСТАЎ**. Ён падкрэсліў, што бюджэт захоўвае сваю традыцыйную сацыяльную накіраванасць, што ў ім прадугледжаны сродкі на мадэрнізацыю вытворчасцяў, а таксама пагашэнне ўсіх даўгавых абавязацельстваў Беларусі. Вядома, што ў бюджэт на 2013 год закладзены сярэдні курс долара ў памеры 8950 рублёў. Наколькі рэальным з'яўляецца такі курс? Ці не заніжаны ён? «Пачатковы прагноз быў на ўзроўні 8400-8500, а зараз закладзена 8950, — кажа прадстаўнік Мінфіна. — Думаю, гэта дастатковы курс, асабліва калі ўлічваць, што гэта сярэднегадавы параметр. Нейкія ваганні магчымы, але ў цэлым я думаю, што гэты ўзровень будзе вытрыманы». Значыць, вышэй курс не павінен узнімацца і бюджэт ад гэтага не пацерпіць? «У сярэднім, не павінен. Мы лічым, што рэзкіх ваганняў, з улікам той палітыкі, якую праводзіць урад і Нацыянальны банк, не павінна быць. Калі мы вытрымаем жорсткія ўмовы, то нічога не павінна здарыцца», — адзначыў Юрый Селіверстаў. Між іншым, Надзея Ермакова, старшыня праўлення Нацыянальнага банка, заявіла, што і бюджэт, і курс долара залежаць ад таго, «як спрацуе эканоміка»: «Чым будзе больш экспарту, тым ніжэй будзе курс».

Змяненні ў Падатковым кодэксе «Звяздзе» пракаментаваў **Дзмітрый КІЙКО, начальнік галоўнага ўпраўлення падатковай палітыкі і даходаў бюджэту Міністэрства фінансаў**: «Асноўная асаблівасць фарміравання падатковай палітыкі на наступны год заключаецца ў тым, што мы, па-першае, павінны забяспечыць збалансаваны бездэфіцытны бюджэт, а значыць, прафінансаваць усе выдаткі бюджэту, якія прадугледжаны законапраектам. Па-другое, мы павінны стварыць умовы для развіцця бізнесу і прыняць захады па спрашчэнні падатковай сістэмы. Таму будуць захоўвацца стаўкі асноўных падаткаў (на прыбытак, на дабаўленую вартасць), але для стымулявання развіцця малога і сярэдняга бізнесу прадугледжана спрашчэнне падаткаабкладання ў гэтай сферы. Па прагнозах самой бізнес-супольнасці, гэта прывядзе да стварэння дадатковых 20000 працоўных месцаў у год. Прычым з высокімі заробкамі». Дарэчы, спецыяліст растлумачыў, што зніжэнне падатковых ставак толькі з аднаго боку зменшыць паступленні ў бюджэт. «З іншага боку, будзе пашырацца база падаткаабкладання. Змяншаючы падатковыя стаўкі, мы разлічваем на тое, што будуць стварацца новыя прадпрыемствы, якія стануць выплачваць падаткі. Таму ў выніку мы нічога не страцім».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# Нацбанк не плануе зніжаць стаўку рэфінансавання ў кастрычніку

**Аб гэтым паведаміла журналістам старшыня праўлення Нацыянальнага банка Надзея Ермакова, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«У кастрычніку мы бачым, што яе знізіць пакуль нельга, таму што ёсць ажыятажны попыт на крэдыты і стаўка на міжбанку перасягнула 50 працэнтаў», — адзначыла Надзея Ермакова.

За верасень на Br900 млрд зменшыліся ўклады ў беларускіх рублях, а прырост укладаў у валюце склаў $260 млн. «Такім чынам, пайшоў трыльён, а прыйшло два трыльёны, але ўжо ў валюце», — растлумачыла кіраўнік Нацбанка. Насельніцтва пакуль не хоча прадаваць валюту, а крэдыты ж цяпер патрабуюцца ў рублях, дадала яна.

Апошні раз Нацыянальны банк зніжаў стаўку рэфінансавання ў верасні — да 30 працэнтаў гадавых. У канцы верасня кіраўнік Нацбанка заяўляла, што да канца 2012 года стаўка рэфінансавання можа знізіцца да 25-26 працэнтаў гадавых.


**М И Н С К И Й   Р А Й О Н Н Ы Й   И С П О Л Н И Т Е Л Ь Н Ы Й   К О М И Т Е Т**

**19 октября 2012 года повторно проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка в Минском районе**

| | | Лот 1 |
|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Ждановичский с/с, район аг. Ждановичи |
| 2 | Кадастровый номер | 623681700001000567 |
| 3 | Площадь земельного участка | 1,5569 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 20 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства многофункционального административного комплекса |
| 6 | Инженерная инфраструктура * | электричество, газ, водопровод, канализация |
| 7 | Сумма убытков и потерь с/х, л/х производства (рублей) | 97 460 210 |
| 8 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 5 492 206 |
| 9 | Начальная цена права заключения договора аренды | 228 067,47 доллара США |
| 10 | Задаток (рублей) | 350 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского д. 8. Дата проведения: **19.10.2012 г. в 10.15.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **15.10.2012 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет № 3641000000223, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Карбышева, д. 13, к. 2, МФО 153001520, УНП 600068187, получатель – Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельным участком.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в аренду единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, заключает с ним договор аренды земельного участка, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

* В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.


## ■ Факт

# ГАЗАВЫ БАЛОН ВЫБУХНУЎ НА ДАХУ

З-за парушэння правілаў пажарнай бяспекі пры правядзенні агнявых работ у Наваполацку пацярпеў мужчына.

— Бліжэй да абеду ў службу МНС паведамілі пра выбух газавага балона пры правядзенні работ па рамонце даху будынка Палаца культуры нафтавікоў, — сказаў «Звяздзе» старшы інспектар цэнта прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч. — У выніку пацярпеў страхар ТАА "Белнафтабуд" — мужчына 1984 года нараджэння. З апёкамі другой ступені 10 працэнтаў паверхні цела (рук, твару) яго шпіталізавалі ў Наваполацкую цэнтральную гарадскую бальніцу. Будынак у выніку выбуху не пацярпеў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АБЗАЦ

◢ **Мінскія паркі 14 кастрычніка закрываюць сезон атракцыёнаў. Рашэнне аб гэтым традыцыйна прымаецца ў кастрычніку, у залежнасці ад ўмоў надвор'я: выкарыстоўваць механізмы і электраабсталяванне ў дождж і пры нізкай тэмпературы забараняецца ў мэтах бяспекі. Атракцыёны закансервуюць да сярэдзіны красавіка, але, калі будзе трымацца добрае надвор'е, два атракцыёны — «Вальс» і «Аўтадром» — яшчэ парадуюць наведвальнікаў Цэнтральнага дзіцячага парку імя Горкага.**

◢ Учора ў Мінску адбылося разбойнае нападзенне на аддзяленне банка, паведамляе БЕЛТА. Неўстаноўлены мужчына, пагражаючы нажом, заваладаў грашыма на агульную суму Br30 млн. Праводзіцца следчыя дзеянні па ўстанаўленні асобы нападаўшага і яго затрыманні.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **П'яныя вайскоўцы ўрэзаліся ў царкву і павіслі на 3-метровай вышыні. Раніцай 8 кастрычніка ў храм, размешчаны на тэрыторыі пасёлка Зарэчча каля Міяса (Чалябінская вобласць), на вялізнай хуткасці ўрэзаўся аўтамабіль ВАЗ-2114. Машына спачатку вылецела на агароджу, якая стала для легкавушкі своеасаблівым трамплінам, з-за чаго аўто падскочыла ўверх, урэзалася ў драўляную сцяну з боку алтара і павісла ў праёме на трохметровай вышыні. Па словах мясцовых жыхароў, у «ВАЗе» знаходзіліся двое вайскоўцаў, якія «былі відавочна нецвярозыя». З цяжкімі траўмамі абодва шпіталізаваны. У момант аварыі ў храме ішла ранішняя служба. Протаіерэй Юрый, які служыў, за пару хвілін да здарэння адышоў ад звычайнага месца каля алтара, што ратавала яму жыццё. Ніхто з вернікаў не пацярпеў.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## Здарэнні

### У СТАРОБІНЕ АРГАНІЗАВАНА НАЧНОЕ ДЗЯЖУРСТВА ДЛЯ ЗЛОВУ МІФІЧНАЙ ЧУПАКАБРЫ

**У пасёлку Старобін Салігорскага раёна арганізавана начное дзяжурства для злову невядомага звера, якога ў народзе празвалі чупакабрай. Аб гэтым БЕЛТА паведаміла старшыня Старобінскага сельсавета Галіна АЛЯКСАНДРАВА.**

Паводле яе слоў, для таго, каб злавіць таямнічага звера, які сістэматычна забівае хатніх жывёл на падворках пасёлка, арганізавана начное дзяжурства з прыцягненнем мясцовых жыхароў і супрацоўнікаў міліцыі. Ахвярамі гэтага звера становяцца куры, гусі, качкі і нават трусы.

«Яшчэ ў мінулую зіму так званая чупакабра душыла ў Старобіне хатнюю птушку. Потым яна знікла. І вось нядаўна зноў з'явілася ў пасёлку», — сказала старшыня сельсавета. Намеснік галоўнага ветэрынарнага ўрача Салігорскага раёна Мікалай ВАРАНЦОЎ лічыць, што хатнюю жывёлу забівае дзікая жывёліна, якой патрэбна лёгкая здабыча. «Хутчэй за ўсё, гэта рысь. Мінулай зімой па слядах на снезе было ўстаноўлена, што хатніх жывёл забівала менавіта рысь», — сказаў ён.

Нядаўна, калі было забіта некалькія дзясяткаў курэй, ветэрынары ўзялі іх тушы для лабараторнага аналізу на бактэрыялагічныя захворванні. Мікалай Варанцоў адмаўляе шаленства: «Шалёная жывёла не стане пераадольваць агароджы падворкаў. Да таго ж пасля заражэння яна можа пражыць толькі некалькі дзён, а ў пасёлку выпадкі забойстваў хатняй птушкі доўжацца нашмат даўжэй», — падкрэсліў ён. Намеснік галоўнага ветэрынарнага ўрача адзначыў, што вызначыць таямнічага забойцу жывёл у Старобіне дапаможа толькі яго злоў. Для гэтага варта прыцягнуць паляўнічых, дадаў ён.

### НЕ ТЫХ «ЗАГНАЛІ»...

**Работнікам Аршанскай міжрайінспекцыі паведамілі пра незаконнае паляванне ў паляўнічых угоддзях Сенненскай раённай структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Дзяржінспектары выехалі на ўказанае месца і ва ўрочышчы Гразіна знайшлі месца здабычы двух дарослых ласёў.**

Падчас разбору было ўстаноўлена, што 43 чалавекі займаліся тут загонным паляваннем. Пры гэтым меўся разавы дазвол на здабычу толькі лася-сяголетка... Шкода прыродзе ад незаконна здабытай дзічыны склала 19 мільёнаў рублёў. Парушальнікаў чакае крымінальная адказнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# СТАЦЬ У ГЛУХУЮ АБАРОНУ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А вось атрымаць неблагі прыбытак ад замежнікаў, якія наведваюць футбол, цалкам верагодна. «Лепшыя пакупнікі — гэта рускія, арабы, а ўжо пасля толькі беларусы», — гаворыць ігар.

Каля палаткі Генадзя, які гандлюе спартыўнай формай, таксама пуста.

— Ведаеце, атрыбутыка прадаецца слаба, — кажа наш суразмоўца. — У нас гэты кірунак наогул не так развіты, як на Захадзе. Паглядзіце, на матчах «Манчэстэр Юнайтэд» увесь стадыён чырвоны, а калі гуляе «Чэлсі» — блакітны. А ў нас, як бачыце, чэргаў няма.

Нягледзячы на гэта, ёсць меркаванне, што паляваць на запаветныя шалікі і іншую «сувенірку» гледачы пачнуць пятнічным вечарам. Павялічыцца не толькі колькасць міні-крамак, але і лічба ахвотных трапіць на матч.

— Самае галоўнае для нашай зборнай — гэта добра настроіцца на гульню, — разважае Граф. — «Пералавмаць» сябе ў першыя 30 хвілін, каб не баяцца. Аднак, мяркую, на трыбунах будуць вольныя месцы. Самы танны квіток — 210 тысяч. Вось і ўявіце, колькі трэба аддаць грошай, каб трапіць на матч з сям'ёй.

Каля дынамаўскіх кас футбольных аматараў сапраўды зусім няшмат. На раніцу серады прадалі прыблізна 15 тысяч білетаў. Нехта хуценька, каб доўга не стаяць на красавіцкім холадзе, набывае квіткі, а астатнія яшчэ толькі раяцца па тэлефоне. І, па вялікім рахунку, гэта не ад таго, што большасць балельшчыкаў яшчэ шчыруе на працы ці паліруе крэслы студэнцкіх аўдыторый. Цэны, якія прапаноўваюць за квіткі, на жаль, не супадаюць з магчымасцямі пэўных людзей.

— Для многіх цана сапраўды завышаная. І яна проста напужала многіх людзей. Іх, напэўна, менш будзе, чым на супрацьстаянні БАТЭ і «Баварыі», — кажа Мікалай, які за матчам назіраць будзе з першага сектара. — Што казаць, аднак і сапернік у Беларусі сапраўды годны. Галоўнае, каб у нашых футбалістаў быў баявы настрой.

Адметна, калі астатніх цікавілі пераважна білеты на матч Беларусь — Іспанія, дык Алёна, студэнтка Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, прыйшла па квіток на «лігачэмпіёнскі» матч БАТЭ — «Валенсія».

— На зборную кошт высокі, задорага, а на гэты матч можна і за 60 тысяч схадзіць.

Аднак без футбола Алёна і ў пятніцу не застанецца. Сачыць за дзеяннямі каманды Георгія Кандрацьева яна будзе па тэлебачанні. З веданнем справы дзяўчына кажа, што «нашым трэба сыходзіць у глухую абарону і гуляць на контратаках». Толькі хваліце балельшчыцу не толькі гэты матч, але і рэканструкцыя стадыёна «Дынама», якая ўжо хутка павінна стартаваць.

— Вельмі сорамна на падобнае табло глядзець, — эмацыйна кажа дзяўчына. — Нeяк ніякавата робіцца перад замежнікамі. Хочацца, каб на новай арэне і «казырок» быў добры. Памятаю, падчас гульні БАТЭ — «Барселона» наогул пад даждом прамоклі. Праклінаў літаральна ўсіх.

❐ ❐ ❐

Заўтрашнім вечарам у Мінску сіноптыкі абяцаюць даволі непрыемнае надвор'е — усяго 4-6 градусаў цяпла. Таму, калі ласка, апранайцеся як мага цяплей. Безумоўна, матч абяцае быць цікавым. Чым? Хоць бы тым, што такія моцныя зборныя, як Іспанія, прыязджаюць да нас зрэдку. Сапраўды, больш камфортна ўбачыць гульню дома, на канапе. Але калі мы яшчэ здолеем з вамі бачыць разам адразу столькі «зорак»? А гэта і галкіпер «Рэала» Ікер Касільяс, абаронцы Серхіа Рамас, Альвара Арбелоа, славутасці «Барселоны» Хаві і Іньеста, а таксама форвард лонданскага «Чэлсі» Фернанда Торэс. І усе яны будуць у Мінску, выйдуць на поле супрацьстаяць нашым хлопцам, якім у гэты халодны дзень неабходна наша гарачая падтрымка. Разумеем, усё ўпіраецца ў цэны. Але такія футбольныя гастралёры ў нашых краях сапраўды рэдкасць. Заўтра, стадыён «Дынама», Беларусь — Іспанія, пачатак у 21:00. Чакаем!




Фота Надзеі БУЖАН.

**Тарас ШЧЫРЫ.**


**Минский районный исполнительный комитет 19 октября 2012 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Горанский с/с, д. Новое Поле | 623681315101000303 | 0,1469 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 2 926 142 | 31 000 000 | 6 200 000 |
| 2 | Колодищанский с/с, аг. Колодищи, квартал № 715, участок № 11 Б | 623683403101007360 | 0,0995 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 3 200 000 | 69 000 000 | 13 800 000 |
| 3 | Михановичский с/с, д. Березина, участок № 4 | 623684200601000033 | 0,1445 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 57 000 000 | 11 400 000 |
| 4 | Михановичский с/с, д. Березина, участок № 13 | 623684200601000038 | 0,1536 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 61 000 000 | 12 200 000 |
| 5 | Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 1 | 623684202601000261 | 0,1404 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 200 000 | 62 000 000 | 12 400 000 |
| 6 | Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 8 | 623684202601000262 | 0,1376 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 200 000 | 60 000 000 | 12 000 000 |
| 7 | Михановичский с/с, д. Кайково, участок № 6 | 623684202601000233 | 0,1532 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 67 000 000 | 13 400 000 |
| 8 | Михановичский с/с, д. Кайково | 623684202601000268 | 0,1468 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 3 500 000 | 100 000 000 | 20 000 000 |
| 9 | Михановичский с/с, аг. Михановичи, ул. Шоссейная | 623684204601001371 | 0,1233 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 400 000 | 103 000 000 | 20 600 000 |
| 10 | Михановичский с/с, д. Плебанцы, участок № 3 | 623684205601000121 | 0,2414 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, водопровод | 2 000 000 | 87 000 000 | 17 400 000 |
| 11 | Михановичский с/с, д. Серафимово | 623684206101000314 | 0,1224 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 1 200 000 | 47 000 000 | 9 400 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **19.10.2012 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **15.10.2012 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 Горанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лот 2 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 Колодищанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

На Лоты 3-11 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 Михановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляется в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

* В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.



# ЛІСТЫ ДА ЖЫЛІБЕРА

## ВАКОЛ МЕДЫЦЫНЫ СА СВЯТЛАНАЙ ДЗЯНІСАВАЙ

**Гэтая размова адбылася ў мінскай гарадской паліклініцы №10, якая дзеліць пацыентаў з амбулаторыяй агульнай практыкі №1.**

**— Дык на паперцы напісана: кабінет 244, — гаворыць мама хлопчыка, які з ранцам за плячыма пайшоў не на ўрок, а «здаваць аналізы».**

**— Значыць, не ўсе нашы ўрачы ведаюць, што калі вы па месцы жыхарства адносіцеся да амбулаторыі, то і мазок вам трэба здаваць у амбулаторыі, а не ў нашым кабінеце.**

**— Але ж мы ўжо прыйшлі да вас, прапусціўшы ўрок у школе. Цяпер у амбулаторыі нас прымуць толькі заўтра, урок зноў будзе прапушчаны, час згублены, а матэрыял на аналіз, між тым, усё роўна прыйдзе да вас.**

**— А я вам кажу: не паложана.**

Вітаю Вас, *monsieur!*

За вокнамі беларускіх дамоў і кватэр — стракаты кастрычнік. Час гэты, асвечаны смакам печанага яблыка, аўсяных бліноў з брусніцамі і груш у мёдзе з жаўткамі (па-радзівілаўску!), а таксама дыфірамбамі некаторых паэтаў з ліку непераўзыдзеных, то бок геніяў (якіх у нас пераўзысці яшчэ імкнуцца), ужо не прымушае шкадаваць аб леце. Затое раіць думаць пра зіму!

Не ведаю, як у Ваш час, monsieur, а ў нас халодная пара года суправаджаецца хваробамі — тым больш, чым разнастайней лекі ў apotheke. І чым больш гэтымі лекамі карыстаюцца, тым часцей даводзіцца звяртацца да ўрачоў. Каб вынайсці сляды хваробы, трэба нанесці візіт у лабараторыю па месцы жыхарства. Здавалася б, зручна: ты заўсёды дакладна ведаеш, куды табе ісці. Але на справе выходзіць не заўсёды зручна і не зусім ведаеш, або ведаеш, але веды твае памылковыя.

Тэрытарыяльнае дзяленне выклікае блытаніну ў тых выпадках, калі ўрач агульнай практыкі прымае пацыентаў у адным месцы, а так званы «вузкі спецыяліст» (гэты фамільярны выраз, якога ў Ваш час не існавала, таму што не магло існаваць, часам, на жаль, цалкам адпавядае прафесійнаму партрэту сённяшняга medico) — у другім. Для першых у нас дзе-нідзе створаны амбулаторыі. Там тэрапеўты слухаюць, як чалавек дыхае, заглядаюць яму ў рот і «пішуць картку». Калі ў чалавека баліць сэрца ці нырка, ён ідзе ў суседнюю ўстанову — паліклініку. Здавалася б, лагічна. Да той пары, пакуль табе не прапішуць «здаць аналізы». З гэтага моманту можна чакаць якога заўгодна абсурду: чалавек раптам сутыкаецца з тым, што яго не прымаюць у адным месцы і зусім не чакаюць у другім. А ўсё толькі з-за таго, што лабараторыя ёсць і тут, і там! Прынцып называецца «каб не парушаць справаздачнасці», monsieur. Часам за ім хаваецца звычайная лянота, часам — жаданне хоць некім кіраваць, няхай сабе і пацыентам, словам, пацыенты ў сучасных паліклініках з'яўляюцца акалічнасцю непатрэбнай, проста лішняй. Я ведаю, monsieur, што ў Ваш час урач ішоў да хворага, каб яму дапамагчы, не наадварот. Ды часы мяняюцца...

Не ведаю, monsieur, ці да душы Вам была наша восень, а мне — падабаецца. Разумею, што salvia з Праванса духмяніцца не так, як у нас мацярдушка, але і першая, і другая служаць людзям. Расліны — слаўныя патрыёты (я, прабачце, не буду дадаваць тут «сваёй Радзімы», як гэта па інерцыі робіць большасць нават самых адукаваных людзей). Вось толькі жыліберцыя — расліна, названая ў Ваш гонар, — у нас чамусьці не расце. Складана, мабыць, ёй на нашай глебе.

■ 36,6°

# ХТО НЕ ПРЫШЧАПІЎСЯ — ГРЫП НЕ ВІНАВАТЫ

**13 працэнтаў насельніцтва краіны прайшлі ўжо імунізацыю супраць грыпу. Мяркуецца, што сёлета да канца лістапада вакцынацыяй такога кшталту будуць ахоплены не менш як 35 працэнтаў беларусаў. Гэта даволі значная лічба, калі гаварыць аб эфектыўнасці прафілактыкі захваральнасці на грып.**

Паводле слоў **намесніка начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Іны КАРАБАН,** на сёння сітуацыя па вострых рэспіраторных вірусных інфекцыях у цэлым знаходзіцца на неэпідэмічным узроўні. Гэты час — самы спрыяльны для антыгрыпознай імунізацыі. Дарэчы, прышчэпкі супраць грыпу трапілі сёлета ў нацыянальны каляндар прафілактычных прышчэпак. Прафілактычныя прышчэпкі, якія фінансуюцца за кошт рэспубліканскага бюджэту, выконваюцца толькі групам рызыкі — гэта, напрыклад, асобы, якія цяжка пераносяць грыпозную інфекцыю; дзеці ад 6 месяцаў да 3 гадоў; цяжарныя; асобы пасля 65 гадоў; дзеці і дарослыя з хранічнымі захворваннямі; прадстаўнікі пэўных прафесій (міністэрстваў унутраных спраў, абароны, па надзвычайных сітуацыях і інш). Астатніх спецыялісты заклікаюць самім паклапаціцца пра сваё здароўе.

— Гаварыць, што не хварэеш на грып таму, што ў цябе добра працуе імунітэт, нельга, — кажа **загадчыца аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка ШЫМАНОВІЧ**. — Антыцелы да грыпу выпрацоўваюцца толькі ў двух выпадках — калі чалавек захварэў або калі ён прышчапіўся. Той, хто ніколі не хварэў на грып або яму не ставілі такі дыягназ, павінен разумець, што ён, хутчэй за ўсё, знаходзіцца ў калектыве, дзе прышчэплена істотная колькасць людзей...

Словам, той, хто вакцынуецца, клапоціцца не толькі пра сябе, але і пра тых, хто побач. Гэта важна і для сем'яў з дзецьмі ва ўзросце да 6 месяцаў — гэтую ўзроставую катэгорыю не прышчэпліваюць, але яна досыць уразлівая...

Каштуе платная вакцына ад грыпу ад 3,5 долара. Усе зарэгістраваныя на тэрыторыі нашай краіны вакцыны эфектыўныя. Прынцыпова адрозніваюцца толькі коштам, які залежыць ад краіны-вытворцы. У сваім саставе прэпараты змяшчаюць прататыпы трох асноўных тыпаў віруса грыпу, што пастаянна цыркулююць у чалавечай папуляцыі. Супрацьпаказанне фактычна толькі адно — схільнасць да алергічнай рэакцыі на курыны бялок.

Надзвычайных сітуацый чарговы сезон уздыму захваральнасці на грып прынесці не павінен, аднак спецыялісты заўсёды маюць на ўвазе, што грып — інфекцыя непрадказальная, а таму сюрпрызаў трэба чакаць заўсёды. Што да свінога грыпу, які ў 2009 годзе выклікаў пандэмію, то ён хутка страціў сваю пандэмічную сілу, перайшоў у шэраг сезонных вірусаў і таксама трапіў у састаў вакцын.

Як вядома, грып сур'ёзна зніжае імунітэт, можа выклікаць хваробы лёгкіх, з'яўляецца найбольш цяжкай рэспіраторнай інфекцыяй. Сезонны ўздым грыпознай захваральнасці традыцыйна чакаецца са студзеня па сакавік. Да таго часу ва ўсіх, хто пройдзе вакцынацыю, імунітэт будзе на піку, што дазволіць не захварэць або перанесці інфекцыю ў лёгкай форме.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

## У Беларусі створана дзейсная сістэма аховы псіхічнага здароўя дзяцей і падлеткаў

**Пра гэта паведаміла галоўны пазаштатны дзіцячы псіхіятр Міністэрства аховы здароўя Іна Пятніцкая.**

У гэтай сістэме працуюць псіхіятрычныя аддзяленні ў стацыянарах і амбулаторныя ўстановы — дыспансеры, у штат якіх уваходзяць урачы псіхіятры-нарколагі, псіхатэрапеўты, псіхолагі. Кожны, хто мае патрэбу ў дапамозе такіх спецыялістаў, можа звярнуцца без папярэдняга запісу на прыём. У прыватнасці, у Мінску такі дыспансэр знаходзіцца па адрасе: вул. Янкі Лучыны, 6. Закон Рэспублікі Беларусь аб аказанні псіхіятрычнай дапамогі і правах грамадзян пры яе аказанні гарантуе невыдаванне медыцынскай таямніцы, дыягназу і прычыны звароту пацыентаў. Дзеці да 14 гадоў пад назіранне псіхіятраў могуць патрапіць толькі з дазволу бацькоў або законных прадстаўнікоў (апекуноў).

Псіхалагічная дапамога не абмяжоўваецца толькі прыёмам у медыцынскіх установах. У кожным абласным цэнтры ёсць кругласутачныя тэлефоны даверу (тэлефон кругласутачнай псіхалагічнай дапамогі дзецям і падлеткам у Мінску — 246-03-03), гарадскія цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей, пры гарадскіх паліклініках арганізаваны цэнтры дружалюбнага стаўлення да падлеткаў. Існуе досыць вялікі штат школьных псіхолагаў.

**БЕЛТА.**

# «ПАД КРЫЛОМ НЯБЕСНАГА АНЁЛА...»

■ Свята душы

**Традыцыйна духоўна-асветніцкая выстава «Пакроўскі кірмаш» праходзіць у сталічным Палацы мастацтва. Напярэдадні Дня маці наведнікі сюды прыходзяць сем'ямі.**

На выставу з'ехаліся каля ста прадстаўнікоў манастыроў і храмаў, праваслаўных прыходаў, выдавецтваў і майстроў народнай творчасці з Беларусі, Расіі, Украіны. Яны забяспечылі вялікі выбар прадметаў царкоўнага ўжытку і рызаў, сувеніраў, набываючы якія можна ўнесці свой уклад у аднаўленне і падтрыманне манастыроў і храмаў. Адметнасць сёлетняй выставы — правядзенне Дня духоўнай кнігі, менавіта таму тут прадстаўлена шмат праваслаўнай літаратуры, аўдыя- і відэапрадукцыі, у тым ліку і новыя ўнікальныя выданні. «Пакроўскі кірмаш» — гэта духоўныя сустрэчы са святарамі, магчымасць умацавацца ў веры і пакланіцца абразам з праваслаўнага свету. Да віцебскай Казанскай цудатворнай іконы Божай Маці, якая захавалася ў Свята-Троіцкім Маркавым мужчынскім манастыры з XVII стагоддзя, ідзе шмат вернікаў. Наведнікаў выставы-кірмашу чакаюць майстар-класы па шыцці цацак і лепцы з гліны. Таксама ў рамках форуму пройдзе цырымонія ўзнагароджання шматдзетных маці.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**







ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

11 КАСТРЫЧНІКА 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 19 (15705)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Ірына ХАНУНІК-РАМБАЛЬСКАЯ:

# «ІДЭАЛЬНЫ ЎЗРОСТ ЖАНЧЫНЫ — 27 ГАДОЎ»

**Чалавек кантрастаў — так можна сказаць пра Ірыну Ханунік-Рамбальскую. Яна працуе на тэлебачанні, выхоўвае дачку, не так даўно захапілася вырабам лялек. Імпульсіўная ў штодзённым жыцці, скрупулёзная і пунктуальная ў працы. Любіць адпачынак, які дазваляе даведацца пра нешта новае. Шчасце шукае ў кожным момантце новага дня. Рух — яе стыхія. І куды б яна ні трапляла, ёй важна ўбачыць адваротны бок жыцця. Сёння Ірына — госць «Чырвонкі».**



***— Ірына, што адчувалі, калі ўпершыню апынуліся ў прамым эфіры?***

— Перш за ўсё, гэта страх і адрэналін. Разумееш, што Ты — адна, а па другі бок экрана на цябе глядзяць тысячы людзей, і ты не маеш права на памылку. Толькі праз некалькі месяцаў я змагла сабой авалодаць. Пастаянны стрэс мабілізуе скрытыя сілы арганізма. І да гэтай пары, калі не выходжу ў эфір тыдзень альбо два, а потым з'яўляюся там, пастаянна адчуваю новыя эмоцыі.

***— У вас ёсць куміры ў тэлежурналістыцы?***

— Куміраў як такіх няма, думаю, што трэба шукаць свой шлях. Але я супраць проста прыгожых твараў у кадры. У нас дастаткова прыгожых і разумных. Я прыхільніца заходняй журналістыкі, дзе вядоўцы на працягу многіх гадоў працуюць са сваімі гледачамі. Важна, каб была сувязь паміж журналістам і аўдыторыяй. Мне падабаецца прафесіяналізм Опры Уінфры, Мацвея Ганапольскага, Андрэя Малахава. А вось фарматы, дзе шмат напускнога і скандальнага, як некаторыя праграмы на НТВ — гэта не маё.

***— У вас былі планы пачаць навучацца рэжысуры. Здзейсніл іх?***

— Я ў свой час хацела паступіць на завочнае аддзяленне, каб вывучаць рэжысуру, але мне сказалі, што гэта не мае сэнсу. Бо нешта змантіраваць, зрабіць раскадроўку, напісаць сцэнарый я і так магу. А каб рабіць гэта на больш высокім узроўні, то трэба ехаць у Маскву альбо ў Піцер. Не хапае часу на гэта. Да таго ж апошнім часам усё часцей працую як актрыса...

***— Акцёрскі вопыт дапамагае ў працы?***

— Мяркую, наадварот. Акцёрская практыка дазваляе адчуць пэўную лёгкасць, таму што не трэба пісаць і запамінаць вялікія тэксты: калі што — можна зняць яшчэ адзін дубль. А ў прамога эфіру — іншая спецыфіка.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*Экстрым*

# ПРЫЦЯГАЛЬНАСЦЬ ПАДЗЯМЕЛЛЯ

## Што прымушае дыгераў рызыкаваць сабой?

**У канцы мінулага месяца медыйная прастора шырока абмяркоўвала выпадак, які адбыўся ноччу на вуліцы Няміга ў Мінску. Пяцёра маладых людзей спусціліся ў каналізацыйную сістэму горада ў раёне рэстарана McDonald's. Аднак вельмі хутка хлопцы сутыкнуліся з праблемай: на паверхні пачаўся дождж, і ўзровень вады пад зямлёй рэзка і вельмі хутка пачаў павышацца.**

Здавалася б, што ноччу можна шукаць у такім нерамантычным месцы, як мінская каналізацыя? Такая думка можа праскочыць у любога чалавека, але толькі не ў дыгера...

На шчасце, хлопцы выратаваліся. З дапамогай сотавага тэлефона (так, мабільная сувязь у Мінску ўжо «дайшла» і да падземных камунікацый) яны выклікалі выратавальнікаў і здолелі замацавацца ў каналізацыі, каб не быць змытымі вадой, што прыбывала. Фінішным для іх стаў візіт у Цэнтральнае РУУС.

Дыгерства — з'ява, якой у межах Беларусі не больш за 20 гадоў. Сутнасць яе заключаецца ў даследаванні ўсяго, што знаходзіцца пад зямлёй і створана чалавекам. Гэта, напрыклад, усё тая ж каналізацыя, танэлі метро, шахты, бамбасховішчы, падвалы, падземныя рэкі.

Звычайна дыгеры — людзі падрыхтаваныя, з вялікім вопытам. Для спуску ў зямлю выкарыстоўваецца якаснае, часам нават прафесійнае абсталяванне. Час вырацаваў у гэтых людзей уласны слэнг, звод няпісаных законаў і правіл. Дарэчы, адным з асноўных з'яўляецца азнаямленне з прагнозам надвор'я перад спускам пад зямлю.

Карэспандэнту «ЧЗ» удалося звязацца з адным з удзельнікаў інцыдэнту на Нямізе. Малады дыгер папрасіў не называць яго імя, аднак адказаў на некаторыя пытанні пра той самы выпадак і пра дыгерства ўвогуле.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

**ДЫГЕРСТВА — з'ява, якой у межах Беларусі не больш за 20 гадоў. Сутнасць яе заключаецца ў даследаванні ўсяго, што знаходзіцца пад зямлёй і створана чалавекам.**



# РАСПЛАТА ЗА ДЫПЛОМ

**Як трэба ставіцца выпускнікам да будучага размеркавання: як да сацыяльнай перавагі або як да малапрыемнага абавязку? Хутчэй за ўсё, калі ставіцца мэта паступіць на бюджэтную форму навучання, мала хто з маладых людзей задумваецца, што праз колькі гадоў за дыплом давядзецца расплачвацца — сваёй сумленнай працай, прычым неабавязкова там, дзе яны пажадаюць: інтарэсы дзяржавы і выпускнікоў могуць не супадаць. І даволі часта не супадаюць. І хоць спрэчкі наконт размеркавання выпускнікоў ідуць не першы год, а ў прыклад прыводзяцца суседнія Расія і Украіна, дзе працаўладкаванне з'яўляецца ўласнай праблемай выпускнікоў, тым не менш у Беларусі дзяржава пакуль не збіраецца адмаўляцца ад гэтага механізму.**

— Размеркаванню быць, пакуль галіны і рэгіёны не скажуць, што інстытут размеркавання ім больш не патрэбны і свае кадравыя пытанні яны могуць вырашыць пры дапамозе найму работнікаў на свабодным рынку працы, — упэўнена **галоўны інспектар аддзела вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Вольга МУШЧЫНСКАЯ.** — Трэба мець на ўвазе, што ў многіх краінах Еўропы з праблемамі пошуку працы сутыкаецца да 50 працэнтаў маладых людзей. А размеркаванне — гэта гарантыя прадастаўлення выпускніку, які яшчэ не мае практычнага досведу, першага працоўнага месца. Прычым малады спецыяліст у гэтым выпадку падстрахаваны з усіх бакоў. Па-першае, наймальнік абавязаны прадаставіць маладому спецыялісту працу па той спецыяльнасці і той кваліфікацыі, якая ўказана ў яго дыпломе і занатавана ў накіраванні. Але самая галоўная прывілея — абарона ад звальнення на працягу двух гадоў. Наймальнік не мае права ўстанаўліваць маладым спецыялістам выпрабавальны тэрмін і не можа звольніць маладога спецыяліста на падставе такой фармулёўкі, як «неадпаведнасць займанай пасадзе па прычыне недастатковай кваліфікацыі».

Асабіста мне слова «замацаванне» не падабаецца. Такое паняцце ў афіцыйных дакументах адсутнічае і было запушчана ў абарачэнне, напэўна, прадстаўнікамі СМІ. Тым не менш усе шырока карыстаюцца гэтым словам. Дык вось я ўпэўнена, што рашэнне маладога спецыяліста застацца і надалей працаваць па месцы размеркавання пасля двухгадовага тэрміну залежыць выключна ад зацікаўленасці наймальніка і ад створаных для жыцця і прафесійнага росту маладога спецыяліста ўмоў. Тым больш што даплаты і іншыя прэферэнцыі, устаноўленыя дзяржавай для маладых спецыялістаў, распаўсюджваюцца пераважна на работнікаў бюджэтных арганізацый і дзейнічаюць толькі на час іх работы па размеркаванні.

Аднак, па нашых назіраннях, не ўсе наймальнікі зацікаўленыя ў так званым замацаванні маладых спецыялістаў. Па неафіцыйнай інфармацыі, якая паступае ў міністэрства ад выпускнікоў, іх бацькоў і з прадпрыемстваў, многіх наймальнікаў, у прынцыпе, задавальняе такая сітуацыя, калі танная рабочая сіла ў асобе маладых спецыялістаў выкарыстоўваецца на працягу двух гадоў, а затым маладыя людзі звальняюцца, паколькі не бачаць перспектыў далейшай сваёй работы ў гэтай арганізацыі. Наймальнік таксама не бачыць у гэтым асаблівай праблемы, паколькі штогод па размеркаванні на месца тых, што выбылі ён зноў набірае маладых спецыялістаў. На жаль, з такімі сітуацыямі даводзіцца сутыкацца ўсё часцей.

## ЗНАЙДЗІЦЕ МНЕ ПРАЦУ ПОБАЧ... З МЕТРО

— Зразумела, што ўсе нашы выпускнікі хацелі б працаваць у любым населеным пункце, дзе ёсць метро. Усе хочуць працаваць у буйной клініцы, прычым адразу «вузкімі» спецыялістамі, але так не атрымліваецца, — жартуе **першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Сяргей ЖАВАРАНАК.** — І хоць у Мінску сёння істотна не хапае ўрачоў практычна ўсіх спецыяльнасцяў, універсітэт не можа працаваць толькі пад патрэбы сталіцы. Рэгіёны таксама просяць накіраваць да іх кадры. Таму мы ўжо сёння прыступілі да збору інфармацыі для будучых наймальнікаў пра тое, дзе жывуць бацькі нашых студэнтаў, ці ёсць у іх жыллё, або размова можа ісці пра маладую сям'ю, створаную ў студэнцкія гады. Калі наймальнік і сапраўды моцна зацікаўлены ў прыцягненні маладога спецыяліста, то гатовы прадаставіць жыллё і яму, і нават «домік для яго цешчы». У часы маёй работы ў Гомельскім медуніверсітэце ў нас былі такія выпадкі. Здараецца, што гараджане цалкам асіміліюцца ў сельскай мясцовасці і з задавальненнем працуюць там урачамі агульнай практыкі, але ёсць і іншыя прыклады, калі нават высокія заробкі і работа побач з домам не могуць утрымаць на вёсцы маладых спецыялістаў.

Сяргей Жаваранак прызнаўся, што кіраўніцтва Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта зацікаўлена ў тым, каб да іх паступалі на вучобу не толькі мінчане. Для задавальнення патрэб рэгіёнаў існуе мэтавы набор. Але ў рэгіёнах не заўсёды якасна падыходзяць да падбору прэтэндэнтаў на мэтавую падрыхтоўку. Не сакрэт, што для маладых людзей з не вельмі высокімі баламі на ЦТ мэтавы набор з'яўляецца ўнікальнай магчымасцю трапіць у кола студэнтаў. Вось толькі якасць іх падрыхтоўкі не заўсёды дазваляе засвоіць складаную праграму медыцынскай ВНУ. Хтосьці з іх паступова выраўноўваецца ў ведах з больш моцнымі аднакурснікамі, а хтосьці адлічваецца з-за непаспяховасці. З іншага боку, абітурыент з мэтавым накіраваннем, які бачыць, што са сваёй колькасцю балаў ён можа паступіць і па агульным конкурсе, можа проста «забыцца» пра сваё мэтавае накіраванне...

## ШКОЛА «МАЛАДЫХ» І ПАДЗЯЧНЫЯ ЛІСТЫ БАЦЬКАМ

Вельмі грунтоўна падыходзяць да падбору маладых кадраў у ААТ «Магатэкс». У першую чаргу сюды запрашаюць на работу тых, хто ў працэсе навучання праходзіў вучэбную практыку на прадпрыемстве. Другі спосаб пошуку — прысутнасць топ-менеджараў прадпрыемства на іспытах у навучальных установах і на студэнцкіх навуковых канферэнцыях. Пры гэтым звяртаецца ўвага на агульную паспяховасць, сярэдні бал за прадметы па будучай спецыяльнасці, актыўнасць у навуковай дзейнасці і перамогі ў алімпіядах.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

## БУДЗЬ У КУРСЕ!

**Па жаданні маладога спецыяліста ў тэрмін яго адпрацоўкі па размеркаванні можа быць уключаны тэрмін службы ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь ці водпуск па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Прычым у водпуск па доглядзе дзіцяці можа пайсці як яго маці, так і бацька.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
11 10 2012 г.

# РАСПЛАТА ЗА ДЫПЛОМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Працэс адаптацыі маладых супрацоўнікаў у калектыве аднолькавы як для тых, хто праходзіў тут практыку, так і для навічкоў. Спачатку для іх праводзіцца псіхалагічны трэнінг на знаёмства і згуртаванасць. За кожным замацоўваецца настаўнік, які навучае і нясе адказнасць за прафесійны рост свайго падапечнага. За першы год работы, які на «Магатэксе» называюць «стажыроўкай», малады спецыяліст павінен засвоіць не толькі вытворчыя этапы, але і выканаць творчае заданне. Тэмы работ узгадняюцца з кіраўніком і адпавядаюць спецыялізацыі і кваліфікацыі нядаўняга выпускніка. Як правіла, заданні маюць творчую накіраванасць і даюць магчымасць праявіць інавацыйныя здольнасці — тое, на што «Магатэкс» сёння арыентаваны. Работы абараняюцца праз год. Узнагароджанне праходзіць на «Вечарах маладых спецыялістаў», дзе прысутнічае вышэйшае кіраўніцтва кампаніі і дылеры з розных краін. Лепшыя прэміруюцца стыпендыямі дырэкцыі, а іх бацькам і выкладчыкам адпраўляюцца падзячныя лісты. Але галоўнае, што маладым супрацоўнікам гарантуецца кадравы рост.

**«Многіх наймальнікаў, у прынцыпе, задавальняе такая сітуацыя, калі танная рабочая сіла ў асобе маладых спецыялістаў выкарыстоўваецца на працягу двух гадоў, а затым маладыя людзі звальняюцца».**

У пачатку жніўня на работу па размеркаванні ў ААТ «Магатэкс» прыбылі больш як 100 маладых супрацоўнікаў: 13 выпускнікоў ВНУ і больш за 90 выпускнікоў ССНУ і прафтэхустаноў. Заўважана, што з кола тых, хто прыйшоў па размеркаванні, застаюцца працаваць на «Магатэксе» 70-80%. Так, з 20 выпускнікоў ВНУ, якія былі прынятыя на работу ў 2010 годзе, плануюць працягнуць кар'еру на прадпрыемстве 13 чалавек. А сыходзяць, як правіла, або для службы ў войску, або з-за пераезду ў іншы горад.

## СТАЛІЦА — ТОЛЬКІ ДЛЯ МІНЧАН?

Як правіла, усіх выпускнікоў пры размеркаванні цікавіць магчымасць атрымання ад наймальнікаў жылля. Умова аб выдзяленні маладым спецыялістам жылога памяшкання наймальнікам можа быць агаворана ў накіраванні на працу і працоўным дагаворы (кантракце). Аднак забеспячэнне маладога спецыяліста жыллём — гэта права, а не абавязак наймальніка. Адзіная гарантыя ў гэтай сферы, замацаваная на дзяржаўным узроўні, — права маладога спецыяліста, які прыбыў па месцы размеркавання, прымацца на ўлік асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, без выканання дадатковых патрабаванняў па тэрміне пражывання ў адпаведным населеным пункце. У тым ліку ў Мінску і Мінскім раёне. Дарэчы, для людзей, якія прыехалі працаваць у Мінск, гэта дзесяць гадоў пражывання ў сталіцы з моманту рэгістрацыі, а ў Мінскім раёне — пяць. Раней узнікалі пытанні з пастаноўкай на ўлік выпускнікоў аспірантуры і дактарантуры, накіраваных на работу ў Мінск, але нядаўна, пасля звароту Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі ў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, гэта праблема вырашылася... Бакі прыйшлі да сумеснай высновы: паколькі выпускнікі, накіраваныя на работу ў адпаведнасці з дагаворам на падрыхтоўку навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі, з'яўляюцца, згодна з Кодэксам аб адукацыі, маладымі спецыялістамі, адпаведна на іх распаўсюджваюцца такія ж гарантыі. У тым ліку і права пастаноўкі ў сталіцы на чаргу на жыллё без дзесяцігадовага пражывання.

**Будзь у курсе!**
**Выпускнікі, якія працуюць у бюджэтных арганізацыях не па месцы жыхарства бацькоў, маюць права на атрыманне льготнага крэдыту для набыцця рэчаў першай неабходнасці.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Было так, як ніколі*

# НАВАТ РЫЖЫК САРВАЎ АПЛАДЫСМЕНТЫ!..

**«Уладар сяла» — такі конкурс для маладых вясковых сем'яў у Чэрвеньскім раёне праходзіць ужо не першы год. Але так, як было сёлета, скажу я вам, здаецца, не было ніколі. У сэнсе — добра. Гасцей сустракала Лядзенская сельская школа, на базе якой праводзілася мерапрыемства. А сем'яў-прэтэндэнтаў на званне было восем, па колькасці сельсаветаў у раёне.**



...На сцэну выходзілі па чарзе: Андрэй і Інга КУШНЕРЫ, Аляксей і Ілона БУРЫЯ, Ігар і Вольга АНАНІЧЫ, Аляксандр і Алеся БУТЫЛА, Ігар і Валерыя ГАРАШЧУК, Віталь і Анастасія АСТРОЎСКІЯ, Аляксандр і Ірына ДЗЬЯЧЭНКІ, Сяргей і Тацццяна КОПАЦЬ.

У «Візітоўцы» маглі паказаць свае таленты таксама і дзеці. Многія з іх, нават зусім «малявачкі», шчыра і з артыстызмам расказвалі, спявалі, чыталі вершы разам з мамамі і татамі. Былі і такія, хто нават іграў на губным гармоніку. А як заспявала адна з дачушак сям'і Копаць, дык кабеты ў зале ледзь слёзы стрымлівалі ад замілавання!..

...Пасля знаёмства падзеі перайшлі на школьны стадыён. Дарэчы, там тыя, хто прагаладаўся, на працягу ўсяго конкурсу маглі смачна і бясплатна перакусіць, бо кожны сельсавет прывёз свае пачастункі. Было ўсё, як на свяце ў гасціннай беларускай хаце: і сальца, і поліўка з бліцамі, і дранікі са смятанаю. Галодным у вясковых гаспадынь, што прыехалі падтрымаць «сваю» моладзь, ніхто не застаўся!..

Конкурсы ва «Уладары сяла» былі «ў тэме»: хто хутчэй ды лаўчэй пілуе ды сячэ дровы; хто шпарчэй носіць ваду ў вядры ды ўважлівей сартуе гародніну; хто ямчэй ставіць чыгуны ў печ, абірае бульбу ды накрывае на стол. Але самым захапляльным атрымалася выпрабаванне з запрэганнем каня. Кожны канкурсант-гаспадар павінен быў упрыгожанага стужкамі Рыжыка «захамутаць», альбо запрэгчы, а маладая гаспадыня пасля гэтага як мага хутчэй садзіла дзяцей у вазок, ды ў ім усе разам на хуткасць давалі кругаля па стадыёне.

***Кожны канкурсант-гаспадар павінен быў упрыгожанага стужкамі Рыжыка «захамутаць», альбо запрэгчы, а маладая гаспадыня пасля гэтага як мага хутчэй садзіла дзяцей у вазок, ды ў ім усе разам на хуткасць давалі кругаля па стадыёне.***

Праўду кажучы, далёка не ў кожнай сучаснай маладой вясковай сям'і ёсць конь. Але нягледзячы на гэта, справіцца з папругамі ды лейцамі здолеў кожны з канкурсантаў. Гаспадары Рыжыка хоць крыху і хваляваліся за жывёліну, але было відаць, што ўдзячныя запрашэнню на гэткае свята. Конік хоць і стаміўся ды пад канец згаладаўся, але ж ніколі ў жыцці не даводзілася яму чуць столькі заахвочвальных воклічаў на свой адрас ды такім маладзецкім галопам несціся вакол зялёнага поля!.. За працу ды стараннасць яго чакала сытая вячэра па дарозе дадому.

Падчас узнагароджання было шмат намінацый і шмат падарункаў. Ніхто не застаўся ў пройгрышы, кожная сям'я была лепшай у чымсьці: творчасці, спорце, гасціннасці.

А галоўных прызоў было адразу два: з блакітнай стужкай і з ружовай. Падчас узнагароджання самі ўзнагароды верашчэлі — хоць вушы закрывай, бо гэта былі парасяты. Гаспадарамі іх стала сям'я Арлоўскіх з вёскі Раванічы. Пад апладысменты, смех і ўхвальныя выгукі публікі Віталь ды Насця панеслі новых гадаванцаў да свайго аўто.

**Наталля КАРАЛЬКЕВІЧ. Фота аўтара.**



# ВЫХАВАЦЬ ГОДНА!



**...«Клянёмся!», «Клянёмся!», «Клянёмся!»... Над пляцоўкай сціхла рэха трохкратнай клятвы, і 56 хлопчыкаў з розных абласцей Беларусі сёлетняга набору сталі сапраўднымі выхаванцамі ліцэя пры Гомельскім інжынерным інстытуце Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**

— Сёлета мы павялічылі набор у ліцэй. Да таго ж, 70 працэнтаў выхаванцаў — гэта сіроты, дзеці з сацыяльных, няпоўных, малазабяспечаных сем'яў. І сёння дзяржава бярэ на сябе клопат пра іх. Бо клопату больш важнага, чым шчаслівае дзяцінства, не прыдумаеш, — адзначыў падчас цырымоніі прынясця клятвы выхаванцамі ліцэя міністр па надзвычайных сітуацыях, генерал-маёр унутранай службы Уладзімір Вашчанка. — А ўзровень адукацыі тут высокі: 90-95 працэнтаў курсантаў паступаюць у вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Свята працягнулася канцэртнай праграмай, якую выхаванцы падрыхтавалі разам з педагогамі ліцэя і навучэнцамі Гомельскага абласнога Палаца творчасці дзяцей і моладзі. Каманда выхаванцаў правяла паказальнае баявое разгортванне. А скончылася мерапрыемства ўрачыстым праходжаннем выхаванцаў па пляцы.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

## БЕЛАРУС ПАВЕЛ КУХТА — ЛАЎРЭАТ МІЖНАРОДНАГА КОНКУРСУ ГІТАРЫСТАЎ У ІТАЛІІ

**Беларускі музыка Павел Кухта стаў лаўрэатам 45-га Міжнароднага конкурсу гітарыстаў імя М. Піталугі, які прайшоў у італьянскім горадзе Александрыя.**

Конкурснае выпрабаванне з трох тураў прайшлі 27 удзельнікаў з 20 краін. Міжнароднае журы конкурсу, якое складаецца з вядучых гітарыстаў, дырыжораў, кампазітараў і музычных крытыкаў, у гэтым годзе было прадстаўлена такімі асобамі, як Альфонса Монтэс (Венесуэла), Бернар Маільё (Францыя), Паола Ферара (Італія), Томас Хэк (ЗША) і іншымі.

Для фіналу кампетэнтнае журы адабрала ўсяго трох выканаўцаў — Керуана Лазар з Францыі, Джэракул Екачай з Тайланда і беларускага гітарыста Паўла Кухту, выпускніка магістратуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Упершыню ў гісторыі конкурсу беларускі гітарыст стаў не толькі ўдзельнікам фіналу, але і лаўрэатам трэцяй прэміі.

**БЕЛТА.**

*Новыя тэхналогіі*

# ПЕРСАНАЛЬНЫЯ СРОДКІ НАВУЧАННЯ: БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ ?

## ... У ЛІЦЭІ БДУ ДРУГІ ГОД АПРАБУЮЦЦА ПЛАНШЭТНЫЯ РЫДАРЫ

**Апошнім часам навінкі ў сферы электронных тэхналогій змяняюць адна адну з фантастычнай хуткасцю і нярэдка ад функцыянальнасці новых прыстасаванняў нават у людзей, якія на «ты» з тэхнічным прагрэсам, проста займае дух. А ці мог хто-небудзь сабе ўявіць яшчэ пяць гадоў назад, што беларускія школьнікі на ўроках будуць мець справу не проста з камп'ютарам (каго ім сёння здзівіш?), а з нэтбукамі і планшэтнымі рыдарамі?**

**Першапраходцамі ў выкарыстанні ў вучэбным працэсе электронных кніг пашанцавала стаць ліцэістам БДУ. Год назад у Ліцэі БДУ стартаваў двухгадовы эксперымент, які павінен даць адказ спецыялістам на многія пытанні. У прыватнасці, наколькі мэтазгодна масава ўкараняць такія прыстасаванні ў школах? Ці ёсць ад іх адчувальны педагагічны эфект? Як выкарыстанне рыдараў уплывае на здароўе падлеткаў? І, нарэшце, ці зможа электронная кніга стаць добрай альтэрнатывай папяроваму падручніку?**



Калі ў БДУ вызначаліся, якому з персанальных прыстасаванняў аддаць перавагу, то бралі пад увагу наступныя крытэрыі: бяспеку для здароўя іх уладальнікаў, кампактнасць і невялікую вагу, наяўнасць сеткавых інтэрфейсаў, прастату ў выкарыстанні і зразумелы інтэрфейс. У выніку выбар спыніўся на планшэтным рыдары «PocketBook Pro 902». У памяць рыдараў былі запісаны электронныя версіі ўсіх школьных падручнікаў, а таксама вучэбна-метадычныя комплексы, распрацаваныя педагогамі Ліцэя БДУ. Рыдары змяшчаюць праграмнае забеспячэнне для чытання практычна ўсіх распаўсюджаных тэкставых і графічных фарматаў, бібліятэку класічнай літаратуры на рускай і англійскай мовах (больш як 500 кніг), 44 слоўнікі на розных мовах свету, праграму агучвання тэкстаў шляхам сінтэзу маўлення, магчымасці для аднаўлення гукавых файлаў, праводныя (USB) і бесправадныя інтэрфейсы (Bluetooth і Wi-Fi). Вельмі зручна, бо ўсё ў любы момант знаходзіцца ў ліцэістаў пад рукой. Пры жаданні заўсёды можна запампаваць і хатняе заданне ад настаўніка, і сваю любімую кніжку з інтэрнэту, а потым яшчэ і з сябрамі падзяліцца ёю праз блютуз. Галоўнае, каб было жаданне чытаць.

— Калі нам першы раз паказалі рыдары, усім было вельмі цікава. Там столькі функцый! Спачатку вывучалі іх, а з цягам часу змаглі па заслугах ацаніць гэта прыстасаванне, — дзеліцца ўражаннямі ліцэістка 11ХБ2 класа Яна Дыба. — Цяпер мы менш часу праводзім ля камп'ютара. Па электроннай пошце настаўнікі нам дасылаюць матэрыялы для ўрокаў, хатнія заданні. І паколькі ўсё гэта можна загрузіць на рыдар, то не прыходзіцца нічога раздрукоўваць. Зусім знікла патрэба звяртацца ў бібліятэку, бо ўсё можна знайсці ў інтэрнэце, асабліва калі патрабуецца спецыялізаваная літаратура, якой часам не знойдзеш у бібліятэцы. Але, безумоўна, нам спатрэбіўся час, каб прызвычаіцца...

— Гэта вельмі зручнае прыстасаванне, — падтрымлівае аднакласніцу Мікалай Арцюшэўскі. — Праўда, пры прачытанні вялікіх мастацкіх твораў асабіста я звяртаюся ў бібліятэку, бо так і па змесце арыентавацца лягчэй, і нейкія карысныя пазнакі для сябе можна рабіць альбо падкрэсліць штосьці важнае. А чытаючы некалькі твораў невялікага памеру, больш зручна мець іх пад рукой, у адным месцы, а не ў некалькіх кнігах.

Адна з перавaг планшэтнага букрыдара, на выкарыстанні якога спыніліся ў Ліцэі БДУ, — выкарыстанне тэхналогіі «электроннай паперы», дзякуючы якой яго экран не свеціцца, не стамляе зрок, у яго няма праблем з вугламі агляду і сонечнымі блікамі. Аднак у працэсе выкарыстання букрыдара нечакана выявілася зусім іншая праблема: у адрозненне ад звычайных кніг, інфармацыя з экрана букрыдара ўспрымаецца інакш...

— Успрыманне інфармацыі з электроннай кнігі патрабуе дадатковых даследаванняў. Сёлета мы збіраемся ўшчыльную заняцца гэтым пытаннем, — зазначае **намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Ліцэя БДУ Ігар ВАРАКСА.** — У нас праводзіліся тэсты як у эксперыментальным класе, дзе выкарыстоўваюцца рыдары, так і ў іншых класах, дзе ў вучняў таксама ёсць уласныя «чыталкі», і высветлілася, што тыя вучні, якія чыталі тэксты з электронных прыстасаванняў, напісалі тэсты па творах горш за тых, якія звярталіся да папяровых крыніц. Варта зазначыць, што зацікаўленасць у прачытанні ва ўсіх была аднолькавая, аднак электронны тэкст успрымаецца інакш. Магчыма, праз некалькі гадоў сітуацыя і зменіцца, бо выкарыстанне электронных кніг стане будзённай справай, і тады ўжо не будзе адчувацца розніцы ва ўспрыманні інфармацыі... Мне асабіста падаецца, што прычына ў тым, што мы з дзяцінства вучыліся трымаць у руках кнігу, а зараз вымушаны пераарыентоўвацца... Пэўная нязручнасць існуе і са стварэннем пазнак. Паколькі адсутнічае клавіятура, то для таго, каб нешта занатаваць, патрэбна зрабіць шмат націскаў. І пакуль робіш гэта, губляецца сэнс таго, што робіш.

У настаўнікаў стаўленне да рыдараў таксама неадназначнае. Па іх словах, ёсць і плюсы, і мінусы... З аднаго боку, электронная кніга не мае каляровага дысплея, а як без выкарыстання колеру вывучаць, напрыклад, тую ж біялогію ці геаграфію? У букрыдарах шмат даведачнага матэрыялу, але больш эфектыўна бывае патлумачыць нешта вучням праз сумесную пабудову табліц. З іншага боку, калі вам на ўроку спатрэбіцца некалькі задачнікаў, то, безумоўна, больш зручна мець іх пад рукой у электронным выглядзе.

Па выніках апытання, праведзенага сярод ліцэістаў БДУ, 12% старшакласнікаў маюць букрыдары ці планшэты ў асабістай уласнасці. Магчыма, ёсць усё ж такі сэнс ісці ў нагу з тэхнічным прагрэсам і падумаць, як на ўсе 100% скарыстацца магчымасцямі, якія ён перад намі адкрывае?

**Алена ДРАПКО.**

**Тэхнічныя характарыстыкі PocketBook Pro 902, задзейнічаных у эксперыменце:**

Працэсар — 533 МГц
Аператыўная памяць — 256 Мб
Пастаянная памяць — 2Гб + MicroSD да 32 ГБ
Памеры 263х190х11
Вага — 530 гр.
Экран 9,7» Viziplex.
Сеткавыя інтэрфейсы — Bluetooth і Wi-Fi.
Аператыўная сістэма Linux
Час аўтаномнай работы — больш за месяц (7-8 тысяч старонак)

## ЗАЛЕЖНАСЦЬ АД САЦЫЯЛЬНЫХ СЕТАК СТАЛА РАСПАЎСЮДЖАНАЙ ПРАБЛЕМАЙ СЯРОД ПАДЛЕТКАЎ

**Распаўсюджанай праблемай у падлеткавым асяроддзі стала залежнасць ад сацыяльных сетак, паведаміў псіхолаг мінскага Гарадскога клінічнага дзіцячага псіханеўралагічнага дыспансера Віктар Губкін.**

Калі малады чалавек мае стасункі з аднагодкамі, таварышамі з дапамогай выключна камп'ютара, не выходзіць у людзі, то ёсць падстава меркаваць, што ў яго існуюць псіхалагічныя праблемы, лічыць спецыяліст. «Пры лячэнні гэтага віду залежнасці нам важна высветліць, чаму дзіця аддае перавагу віртуальным стасункам, а не рэальным, што яму перашкаджае выйсці ў калектыў і мець стасункі са сваімі аднагодкамі або бацькамі», — адзначыў Віктар Губкін.

*Попыт і прапанова*

# КУРСАВАЯ ПАД ЗАКАЗ,

## ГРОШЫ ЁСЦЬ, А АСТАТНЯЕ ДАСЦА?

**Як толькі прыходзіць час здаваць курсавыя, тэмы размоў у студэнцкіх кампаніях круцяцца вакол аднаго: як за некалькі дзён перагледзець і прааналізаваць стос кніг, артыкулаў, а пасля яшчэ напісаць добрую працу, за якую выкладчыку будзе проста сорамна паставіць нізкую адзнаку. Некаторыя не-не ды і ўспомняць пра халяўны варыянт — замовіць патрэбнае ў фірме, якая спецыялізуецца на «дапамозе студэнтам». Але часцей гэты шлях адпадае: усё каштуе грошай, а іх у студэнтаў традыцыйна няшмат. Тым не менш такія фірмы існуюць і заяўляюць пра сябе праз рэкламкі ў вагонах метро, афішы на вуліцах і, вядома ж, у інтэрнэце.**

### ПРАПАНОВЫ І ПАДВОДНЫЯ КАМЯНІ

На запыт «замовіць курсавую мінск» пошукавая сістэма выдае больш як 170 тысяч спасылак. Відаць, паслуга карыстаецца папулярнасцю. Сайты дастаткова добра напоўнены інфармацыяй: расцэнкі на рэфераты, кантрольныя, курсавыя, дыпломныя працы, а таксама на справаздачы аб праходжанні практыкі. Фірмы абяцаюць, што іх супрацоўнікі падрыхтуюць абсалютна ўнікальныя тэксты са спасылкамі на навуковую літаратуру, больш за тое, афармяць працу згодна з патрабаваннямі ВНУ.

Дарэчы, наконт цаны. Кошт прац можа вар'іравацца ад 320 тысяч да 1,3 мільёна рублёў у залежнасці ад таго, да якой галіны навук адносіцца праца, курсавая гэта ці дыпломная работа. Таксама цана будзе вышэйшай, калі студэнт пажадае атрымаць працу вельмі тэрмінова.

Пра тое, што бізнэс у сферы «дапамогі студэнтам» набірае абароты, сведчаць акцыі на сайтах гэтых фірмаў. Напрыклад, калі аформіць пажадае ўся група, прадугледжана зніжка 10% + 1 работа бясплатна.

Калі ёсць грошы, спакуса заказаць курсавую даволі вялікая. Тым больш што фірмы абяцаюць не толькі напісанне працы, але і дапрацоўку, калі гэта спатрэбіцца. Праўда, гэта толькі абяцанні. У рэчаіснасці даволі часта замест унікальнай курсавой працы аддаюць плагіят чыстай вады — вось вам і падводны камень.

### ВЫКЛАДЧЫЦКАЯ КОНТРАТАКА

У выкладчыкаў да такіх прац стаўленне рознае. Самыя справядлівыя могуць не залічыць работу ўвогуле: сапраўды, адзін студэнт шмат дзён правёў у бібліятэцы, шукаў інфармацыю, не спаў па начах. А другі — проста заплаціў грошы. Аднак у некаторых ВНУ выкладчыкі, нават разумеючы, што праца гэта не самастойная, глядзяць на такую з'яву скрозь пальцы, калі студэнт вучыцца на завочным і працуе.

Зноў жа, зробленая на заказ праца можа выдаць сябе тым, што не пройдзе праверку па спецыяльнай антыплагіятнай праграме, якая даволі часта выкарыстоўваецца ў многіх вучэбных установах. Часта ўзятымі з інтэрнэту бываюць цэлыя фрагменты работ.

Пра свой вопыт з «купленымі» курсавымі расказвае выкладчык Інстытута журналістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Гражына ПАЎЛОЎСКАЯ:

— Так, шмат разоў такое было. Звычайна вяртаю работу назад, а аднойчы, убачыўшы нахабны плагіят і даведаўшыся, з якой крыніцы «садрана», у якасці навуковага кіраўніка па дыпломнай пісала службовую запіску, каб дыпломніцу не дапусцілі да абароны. Тут, мяркую, дапамажа толькі кардынальны перагляд умоў экзамену (абароны дыплома). Я лічу, што ў нас сёння вельмі нізкія патрабаванні да зместу навуковых прац.

З іншага боку, разумею калег, якія такім чынам зарабляюць грошы. У мяне ёсць некалькі знаёмых, якія за грошы пішуць не проста дыпломы — дысертацыі! І гэта бяда сістэмы адукацыі.

Каб даведацца, ці самастойна студэнт працаваў над курсавой, выкладчык можа задаць некалькі спецыфічных пытанняў па тэме. А калі працу і ўвогуле трэба абараняць перад камісіяй, то шанцаў на поспех можа застацца зусім няшмат. Адна справа, калі работа не вельмі добрая, але напісана самастойна і студэнт больш-менш разбіраецца ў тэме, і іншая — калі працу пісаў абсалютна іншы чалавек, а «заказчык» толькі перачытаў яе змест.

### ІНТЭРНЭТ — ДЛЯ ГУЛЬТАЁЎ?

Даволі распаўсюджанай з'яўляецца такая паслуга, як замова пэўнай інфармацыі праз інтэрнэт з дапамогай sms-паведамленняў. Так, напрыклад, патрабуецца рэферат на пэўную тэму, але браць работы з партала агульнага доступу не хочацца. У такім выпадку ёсць такая паслуга, як платнае sms-паведамленне. На пэўны нумар, указаны на сайце, неабходна адправіць smsку, з рахунку знімецца пэўная сума, узамен прыходзіць паведамленне са спецыяльным кодам. Увёўшы яго, можна атрымаць неабходную інфармацыю.

Аляксандра, студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, мае пэўны вопыт у такіх справах:

— Я шукала курсавыя і рэфераты ў «нэце», — дзеліцца дзяўчына, — але нічога з агульнадаступных тэкстаў мне не падыходзіла. На адным рускамоўным сайце знайшла нешта больш-менш адпаведнае, але для таго, каб спампаваць гэтую інфармацыю, папярэдне трэба было адправіць smsку. Вырашыла паспрабаваць, бо ў людзей заказваць такія працы даражэй. Гэта аказаўся не «развод» — змагла перапісаць усё. Дарэчы, кошт адной smsкі ў іх — 3900. Інфармацыя была арыгінальная. З таго часу я часта карыстаюся такой паслугай.

### МАРКЕТЫНГ ПРАЗ «УКАНТАКЦЕ»

Нядаўна да мяне ў «сябры» дадаўся нейкі «тып» з цікавым імем, узятым з казак Пушкіна. Спачатку я не зразумела, што гэта такое. Падумала, можа нехта з сяброў вырашыў так пажартаваць. Аказалася, фірма, якая спецыялізуецца на падрыхтоўцы платных матэрыялаў для студэнтаў, такім чынам шукае сабе кліентаў. Дарэчы, мяне трошкі здзівіў кошт работ — на 200 тысяч даражэй, чым на іншых сайтах.

Больш за тое, пад такой жа назвай функцыянуе група «УКантакце» (ад той жа фірмы), дзе ўсе, хто цікавіцца такога кшталту паслугамі, могуць замовіць сабе курсач, не выходзячы з пакоя.

У народзе кажуць: ёсць попыт — будзе і прапанова. Аднак якімі спецыялістамі стануць такія студэнты?

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

11 10 2012 г.

# «ІДЭАЛЬНЫ ЎЗРОСТ ЖАНЧЫНЫ — 27 ГАДОЎ»



**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

**— Як змянілася ваша жыццё пасля таго, як вы сталі мамай?**

— Калі ты адзін, то думаеш пра тое, як будзеш зарабляць, ці зможаш паспець усё. Ёсць няўпэўненасць, што ўсё атрымаецца. А калі з'яўляецца дзіця, то знаходзяцца і сілы, і сродкі, і час. Дзіця добра мабілізуе. Я на ўсё цяпер гляджу праз прызму дзіцяці.

**— Як выхоўваеце дачку?**

— Паколькі праца адбірае шмат часу, выхаваннем часцей займаецца бабуля. І з-за гэтага дачка ў некаторых пытаннях — капрызніца. Але я імкнуся правільна размяркоўваць яе час на працягу дня. Зараз яна займаецца ў тэатральнай школе, а таксама мы ходзім на гімнастыку ў школу алімпійскага рэзерву. Бо калі не арганізоўваць яе час, то ён будзе страчаны на мульцікі, і карысці ад гэтага менш, чым ад заняткаў. Пры магчымасці, безумоўна, пешчу яе.

**— Кажуць, каб зразумець жанчыну, трэба нарадзіцца ёю. На ваш погляд, у чым жаночая выключнасць?**

— Жанчына мае магчымасць адчуць радасць мацярынства, нараджэння, што неспасціжна для мужчыны. Гэта вышэйшае шчасце, дадзенае нам. І ў гэтым наша сіла.

**— Вы паспяховая, прыгожая, а недахопы маеце? І як з імі спраўляецеся?**

— У мяне шмат недахопаў. У штодзённым жыцці я імпульсіўная і неарганізаваная. У мяне сем пятніц на тыдні. А вось у працы, наадварот, вельмі засяроджаная і пунктуальная. Хацелася б неяк усё сістэматызаваць. Я лічу, што лепшы спосаб справіцца са сваімі заганамі — гэта ўвесь час працаваць над сабой.

**— Мода і камфорт — саюзнікі ў вашым гардэробе?**



— З узростам яны ўжо існуюць у саюзе. Я, шчыра кажучы, ужо не памятаю, калі апошні раз была на абцасах, ведаючы, што ніякіх мерапрыемстваў не запланавана. У сукенках я таксама не заўсёды камфортна сябе адчуваю. Звычайна — балеткі, боты і стандартны набор — джынсы і майкі. Пры гэтым люблю купляць прыгожае адзенне. Мне здаецца, што калі ты сам адчуваеш сябе камфортна, то і людзі арганічна ўспрымуць твой знешні выгляд.

**— З узростам жанчыны імкнуцца захаваць сваю прыгажосць. Ці варта дзеля гэтага рабіць пластыку?**

— У кожнага ёсць права выбару. Я супраць перабору ў такіх рэчах. Але бываюць выпадкі, калі гэта неабходна. Так, я «рабіла» кончык носа, бо гэта была прафесійная патрэба. Затое цяпер я не маю ніякіх праблем з ракурсамі. Але я не пагаджуся на ботакс, які знішчае ўсю міміку на твары. З узростам адважыцца на такія крокі няпроста, бо пачынаеш задумвацца пра наступствы. Любое імкненне да прыгажосці не павінна ўяўляць рызыку для здароўя.

**— Узрост упрыгожвае жанчыну?**

— Думаю, што так. Я не хацела б вярнуцца ў сваё 20 гадоў, таму што мне камфортна з тым светаадчуваннем, якое ў мяне цяпер. У юным узросце многіх рэчаў яшчэ не разумееш. Хочаш нешта даказваць, прысутнічае максімалізм. Для мяне ідэальны ўзрост жанчыны — гэта 27 гадоў. Мне здаецца, у гэтыя гады знешняя прыгажосць знаходзіцца ў сімбіёзе з жыццёвым вопытам. А вось 30 гадоў — ужо нейкая мяжа, якую патрэбна пераступіць.

**— Калі параўнаць восень з жанчынай, то які б яе партрэт вы намалявалі?**

— Гэта жанчына ў залатым узросце. Яе прыгажосць тоіць у сабе пяшчоту і не раздражняе. Яна імклівая і непрадказальная па характары. Гэтая жанчына здольная змяніць многае ў сваім жыцці.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з уласнага архіва гераіні.**

# ПРЫЦЯГАЛЬНАСЦЬ ПАДЗЯМЕЛЛЯ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

**— Раскажы, навошта вы спусціліся пад зямлю ў той самы дзень праігнараваўшы прагноз надвор'я?**

— Усё тлумачыцца вельмі проста: да спуску пад зямлю нас падштурхнулі вельмі прыгожыя фотаздымкі з калектара, якія былі зроблены іншымі дыгерамі да нас. Мы ўбачылі іх у інтэрнэце і вырашылі паглядзець на падземныя славутасці сваімі вачыма. Дарэчы, калі мы толькі спусціліся ў калектар, дык толькі ўпэўніліся ў правільнасці нашага выбару. Усё ж такі дыгеры бачаць тое, з чым звычайным людзям не выпадае пазнаёміцца.

Прагноз надвор'я мы праігнаравалі толькі з-за ўласнай дурасці. У ім быў указаны ўзровень ападкаў 4-5 міліметраў за 6 гадзін, гэта менш за міліметр у гадзіну. Кажучы шчыра, хацелася нейкага экстрыму, і мы не баяліся. Вядома, мы не маленькія хлопчыкі, разумелі адказнасць перад сабой. У нас была ўся неабходная для дыгераў амуніцыя. Хаця звычайна спускацца пад зямлю ў любы дождж дыгеры не рызыкуюць.

**— А потым?**

— Потым, мне здаецца, некаторыя з нас пашкадавалі. Прыкладна а другой гадзіне ночы мы спусціліся ў лўневы калектар на Нямізе (менавіта ў яго сцякае ўся вада падчас дажджу) і пачалі рухацца ў бок Свіслачы, туды, дзе калектар «Няміга» ўпадае ў калектар «Цэнтр». Мы дайшлі да канца калектара, там паспелі падсілкавацца і потым заўважылі, што ўзровень вады пачаў расці.

Адразу ж максімальна хутка пачалі рухацца ў тым напрамку, адкуль прыйшлі, спадзяваліся паспець вылезці з таго самага люка, праз які залезлі. Літаральна за 40 секундаў узровень вады падняўся ад шчыкалатак да пояса, і мы пачалі шукаць месца, каб падняцца вышэй і перачакаць гэты ўздым.

Хутка знайшлі люк. Пад ім мы застрахаваліся вяроўкай і гэтак павіслі, чакаючы, што ўзровень вады паніізіцца. Адзін з хлапцоў, які вісеў бліжэй за ўсіх да люка, пачаў панікаваць, і мы вырашылі выклікаць выратавальнікаў. З-за хвалявання не маглі зразумець, ці ўспрымае жанчына-дыспетчар нас усур'ёз. Тым больш, размаўляў з ёй той самы хлопец-панікёр, а самі мы не ведалі дакладна, дзе і пад якім люкам знаходзімся. Многія з іх пад асфальтам ці проста зачынены, і адчыніць свой мы не маглі.



Выратавальнікі прыехалі даволі хутка, але не маглі нас знайсці, мы ім таксама нічога патлумачыць не здолелі. Спрабавалі крычаць, але наўрад ці нас было чутно. Урэшце вада пачала спадаць, і мы прадоўжылі шлях да выхаду. На паверхню выбраліся там жа, дзе і спускаліся. Амаль адразу нас знайшлі міліцыянеры, потым з'явілася і машына выратавальнікаў. Яны пераканаліся, што медыцынская дапамога нам не патрэбна, і з'ехалі. А мы — у РУУС...

**— Што з адказнасцю за вашыя дзеянні? Не баіцеся?**

— У міліцыі ў нас узялі асабістыя даныя, сказалі, што патэлефануюць, калі дадуць прававую адзнаку нашым дзеянням. Наколькі мне вядома, пакуль нікому з хлапцоў не тэлефанавалі.

> **Літаральна за 40 секундаў узровень вады падняўся ад шчыкалатак да пояса, і мы пачалі шукаць месца, каб падняцца вышэй і перачакаць гэты ўздым.**

**— Не збіраешся «завязаць» са сваім хобі?**

— Не, я атрымаў вельмі добры вопыт. Зараз проста буду ведаць, што заўжды трэба быць максімальна сканцэнтраваным і не рызыкаваць на пустым месцы. Тым больш, акрамя дыгерства, я займаюся экстрэмальнымі відамі спорту, напрыклад, крос-кантры. Гэта такія гонкі на веласіпедах па перасечанай мясцовасці. А вось хлопец, які запанікаваў, верагодна, «наеўся» дыгерствам.

**— А ці даўно ты зацікавіўся дыгерствам і пачаў ім займацца?**

— Так, даўно, прыкладна гадоў восем-дзевяць таму. Мы гулялі ў «Схватку» («Схватка» — адна з першых начных гульняў на тэрыторыі СНД, бярэ свой пачатак у 2001 годзе з Мінска. Сутнасць яе заключаецца ў пошуку камандамі «ключоў» ці адзначаных пунктаў на пэўнай мясцовасці, звычайна ў гарадскіх умовах. Зараз гульня і яе варыяцыі вельмі папулярныя ў розных кутках СНД і замежжы. — **Заўв. аўтара**) і адзін з «ключоў» знаходзіўся ў закінутым будынку, дзе мне давялося паўзці каля 50 метраў праз невялікую шчыліну. Ужо на наступны дзень я прыйшоў, каб даследаваць гэты будынак не падчас гульні, а самастойна.

**— А чым дыгеры займаюцца на аб'ектах, якія вывучаюцца імі?**

—- Галоўнае і першае правіла: ніякага марадзёрства. Дыгеры проста прыходзяць на аб'екты, разглядаюць іх, робяць цікавыя фотаздымкі. Прычым нічога не чапаюць, нават дробных прадметаў. Мы пакідаем іх, умоўна кажучы, нашым нашчадкам. Хаця, вядома, ёсць людзі, якія не карыстаюцца гэтым правілам. Аднак гэта ўжо не дыгеры, гэта марадзёры і вандалы.

❑❑❑

Пасля размовы з мінскім дыгерам, які знайшоў-такі для сябе вагон і маленькі вазок прыгод і адрэналіну, мне падалося, што вышэйназваную праблему можна вырашыць неяк інакш, чым штрафамі і пакараннямі. Не змагацца з тым, што складана прагматычна, а распачаць дыялог.

Пагаджаецца са мной і суразмоўца:

— Думаю, ніводны дыгер не адмовіўся б дапамагчы ў вывучэнні падземных камунікацый горада. Проста з імі ніхто і ніколі не выходзіў на дыялог. Нават тыя ж самыя археолагі... Яны маюць вельмі добрую дакументальную базу, але, магчыма, не гараць жаданнем спускацца пад зямлю. А многія мае «калегі» гатовыя спускацца туды хоць кожны дзень, у іх хапае вопыту, ёсць амуніцыя...

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

**Фота з інтэрнэту.**

*Цягнуць–пацягнуць...*

# «НЕВЫНОСНАЯ» СТУДЭНЦКАЯ СУМКА

## «ЧЫРВОНКА» ВЫСВЯТЛЯЕ: ШТО ПАКУЮЦЬ У ЯЕ КЛАПАТЛІВЫЯ БАЦЬКІ І ЎДЗЯЧНЫЯ ДЗЕЦІ

**...Нядзеля, вечар. На чыгуначным вакзале з цягнікоў выходзяць сотні студэнтаў з вялізнымі чамаданамі, заплечнікамі, сумкамі. Адны са сваёй ношай упэўнена спраўляюцца, іншых яна цягне да зямлі. Паступова сумкі «распаўзаюцца» па горадзе, а іх змесціва так і застаецца таямніцай. І ўсё ж цікава запытацца: што ў асноўным вязуць з дому цяперашнія студэнты?**

### УСЁ СВАЁ... ВАЖУ З САБОЙ

Хацелася б адразу прадоўжыць гэтае вядомае выслоўе як належыць, але ж у студэнцкім побыце часам вывозіць зусім інакш. Усё сваё... у інтэрнаце не змяшчаецца. Ці не ўпісваецца ў правілы здымнай кватэры.

**Марына, 19 гадоў:**

— Думаю, не толькі ў мяне адной уздымаецца настрой ад новай сукенкі, блузкі ці туфлікаў. А хто забароніць дзяўчыне заўжды хадзіць з добрым настроем?! Наведваюся ў крамы і папаўняю гардэроб досыць часта. Дзякуй бацькам, разумеюць маю «слабасць». У інтэрнацкай шафе асабіста для мяне — дзве паліцы і колькі сантыметраў у аддзяленні з вешалкамі, дзе мае рэчы вельмі цесна «кантактуюць» з адзеннем суседак. Ці трэба казаць, што ўсе свае рэчы захоўваць у інтэрнаце проста не маю магчымасці. Таму калі еду да бацькоў, большая частка майго багажу — адзенне, якое бяру на змену. Асабліва цяжкімі сумкі атрымліваюцца на мяжы сезонаў: вязу цёплыя боты і паліто. Ну і два любімыя вязаныя світары нямала месца займаюць. Цяжка, але я лепей каўбасу дома пакіну, чым без адзення застануся. Мой сябар нават неяк пажартаваў, што я, відаць, кофтамі і харчуюся, раз так упарта важу іх у вялізным чамадане.

**Максім, 22 гады:**

— Атрымліваю эканамічную спецыяльнасць, хоць маім хобі яшчэ са школы была фатаграфія. Не пайшоў у прафесіяналы з-за цвярозага разліку: калі цябе не ведаюць, грошай адразу такое захапленне не прынясе, а захрасныць на фатаграфаванні вяселляў неяк не хацелася. Да таго ж яшчэ дадалося жаданне бацькі ўзяць мяне памочнікам у невялікі сямейны бізнэс. Так усё і вырашылася.

Але ж фатаграфію я не пакінуў. Акрамя лічбавай тэхнікі, якая са мной заўжды, я часам люблю паздымаць на плёнку. І праяўляю, і здымкі раблю сам. Як ужо атрымліваецца. Пачытаў крыху кніжак і параіўся са знаёмымі фатографамі. І старэнькі «Зеніт», і ўсё абсталяванне было ў маіх бацькоў. Наважыўся прывезці гэтую нялёгкую канструкцыю ў Мінск. Давялося заняць стол майго суседа, з якім на дваіх здымаем аднапакаёўку, і крыху падкарэктаваць функцыі ваннай. Пакуль што сусед на практыцы, але ж, думаю, пасля яго вяртання прыйдзецца мне да часу развітацца з уласнай «фоталабараторыяй».

**Алеся, 21 год:**

— На першым курсе я знайшла цудоўны пакой у кватэры недалёка ад універсітэта. Маімі суседкамі былі дзве крыху старэйшыя дзяўчыны, якія займалі два астатнія пакоі. Гаспадыня з намі не жыла і абяцала наведвацца раз на месяц за аплатай.

Я аддала грошы і падумала, што жадала б бачыць яе яшчэ радзей. Не, зусім не таму, што не знайшла агульнай мовы. Проста дагэтуль я была з усімі людзьмі, у якіх мы з мамай шукалі кватэру, вельмі праўдзівай. І адразу казала, што разам са мной будзе жыць любімая кошка Руся. Аказваецца, гаспадару жывёл знайсці жыллё практычна немагчыма. Адмаўляліся нават за дадатковую плату. Руся вельмі акуратная, ніводнага разу не падрапала шпалеры і мае вельмі ціхі голас. Але ж хто ў гэта паверыць.

Можа, некаторыя пасмяюцца з такой маёй прывязанасці да кошкі, але ж я сама некалі папрасіла бацькоў купіць мне кацяня, сама яго даглядала і лічу, што адказнасць за жывёлку ляжыць толькі на мне, што б ні здарылася. Карацей, я збіралася прывезці Русю цішком, а на час прыходу гаспадыні — на колькі хвілін хаваць у шафе ці яшчэ дзе-небудзь. Марная справа, як аказалася.

...Я везла сваю кошку ў электрычцы і ўсю дарогу яе супакойвала. Дома Руся хутка асвоілася, і ўжо думалася — праблем не будзе. Праз два дні я вярнулася з заняткаў і заспела ў кватэры гаспадыню. Размова была непрыемнай, і пасярод тыдня вечарам я зноў села ў электрычку, каб адвезці Русю дадому.

### ТАКОГА Ў МІНСКУ НЕ КУПІШ

Рэжым харчавання парушаць нельга. Так казалі адзін казачны герой і мая аднакурсніца, якая заўжды прыходзіла на заняткі з «ссабойкамі». Рэзка адвыкаць ад любімых хатніх страў зусім некарысна. Аматары напакаваць у сумку паболей ежы знайшліся чамусьці выключна сярод хлопцаў.

**Аляксей, 18 гадоў:**

— Бацькі мае, відаць, думаюць, што ў Мінску я нічога не ем, бо, калі прыязджаю дадому, у сумку мне пакуюць катлеты, адбіўныя, хатнюю каўбасу, яшчэ і мяса сырое, яйкі, у сезон — гародніну. Таксама важу слоікі з хатнімі нарыхтоўкамі. Любімыя марынаваныя агуркі, а яшчэ — вішнёвы кампот. Цяжкавата, праўда, цягнуць трохлітровы слоік, але ж як смачна пасля.

**Міша, 19 гадоў:**

— Часта дадому не езджу, бо дабірацца нязручна. Паесці, вядома, люблю. Магу расту яшчэ ці што там, не ведаю. Вывозіць бацькоўскія запасы — гэта не для мяне. Усё роўна, прывезенай ежы хопіць добра калі дзён на пяць. Таму стараюся неяк абыходзіцца грашыма, якія ўдаецца зарабіць падпрацоўкай, і стыпендыяй. Бацькі могуць купіць мне адзенне, але гэта калі яно сапраўды неабходнае. Адзінае, што важу з дому — смачнае сала, якое ўмее саліць толькі мая бабуля. У Мінску такога не купіш.

**Артур, 22 гады:**

— Ад майго роднага горада ў Мінск добра ходзяць «маршруткі», бацькі рэгулярна прадукты перадаюць. Цягнуць на сваіх плячах што-небудзь даводзіцца рэдка. Што звычайна кладуць у сумку? Ну, бацька ў мяне рыбак, таму часта рыбку смажаную перадаюць. Але самае любімае, — безумоўна, хатняе арэхавае печыва, шакаладны бісквіт ці кексы. Хутчэй ад мяса адмоўлюся, чым ад салодкага. Па праўдзе, я ўжо даўно зарабляю на сябе грошы, і на ежу, зразумела, мне таксама хапае. Але ж паспрабуй адмовіцца ад хатняй смакаты. Адразу бацькі крыўдзіцца пачынаюць.

### АЛЬБО ГРОШЫ, АЛЬБО НІЧОГА

Хрусткія купюры кішэні не абцяжараць, а сумкі не абцяжарваюць тым больш. Проста не возяць іх студэнты ў такой колькасці.

**Карына, 19 гадоў:**

— Чаму ты пытаешся пра сумкі з прадуктамі? Вось адкажы, што зручней для маёй маці: пайсці ў краму ў нашым горадзе, купіць сыру, масла, бульбы, мяса і чаго яшчэ, а пасля аддаць мне, каб я ўсё гэта ў Мінск завезла, альбо даць грошы, каб я змагла ўсё тое ж самае купіць у краме побач з інтэрнатам? Уся ежа «едзе» з дому ў маім кашальку, а сумак цяжкіх не прызнаю наогул. Навошта здароўем рызыкаваць?

**Іна, 21 год:**

— Я аднойчы прывезла сумку пасля Вялікадня. Рукі пасля гэтага балелі і дрыжэлі яшчэ і на наступны дзень. Цяпер сябе шкадую. Цяжкія прадукты накшталт бульбы бацькі прывозяць некалькі разоў на год на машыне. Атрымліваецца, у асноўным з дому бяру альбо грошы, альбо нічога.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# БДУ ЗНОЎ У ТОП-700 ЛЕПШЫХ УНІВЕРСІТЭТАЎ СВЕТУ

**Днямі быў апублікаваны новы рэйтынг QS World University Rankings. Па версіі вядомага брытанскага агенцтва QS, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт зноў трапіў у ТОП-700 лепшых універсітэтаў свету.**

Трэба патлумачыць, што рэйтынг QS заснаваны на аналізе звестак аб ВНУ і апытаннях незалежных экспертаў. Ацэньваюцца акадэмічная рэпутацыя ВНУ, вынікі апытанняў працадаўцаў, індэкс цытавання навуковых работ за апошнія 5 гадоў, суадносіны колькасці выкладчыкаў і студэнтаў, а таксама колькасць замежных студэнтаў і выкладчыкаў.

Першым чатыром сотням універсітэтаў прысвойваюцца ў рэйтынгу канкрэтныя месцы, а з 400 па 700 пазіцыі вызначаюцца месцы ўніверсітэтаў у групах. БДУ другі раз у сваёй гісторыі трапіў у рэйтынг QS, заняўшы месца ў групе 501—550.

Першую пазіцыю ў рэйтынгу займае Масечусецкі тэхналагічны інстытут (ЗША). З расійскіх ВНУ лепшыя, чым у БДУ, пазіцыі маюць МДУ імя Ламаносава (116), Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт (253), МФТІ (352), Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін (367), Навасібірскі дзяржаўны ўніверсітэт (371) і Уральскі федэральны ўніверсітэт (451—500). У групе разам з БДУ аказаліся яшчэ дзве расійскія ВНУ — Расійскі ўніверсітэт дружбы народаў і Вышэйшая школа эканомікі.

Па выніках гэтага даследавання, сярод вышэйшых навучальных устаноў СНД сёлета БДУ перамясціўся з 10-й на 9-ю пазіцыю. Акрамя расійскіх ВНУ, наш БДУ абышлі дзве казахстанскія ВНУ — Еўразійскі нацыянальны ўніверсітэт імя Гумілёва (369) і Казахстанскі нацыянальны ўніверсітэт (390 месца).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

РРБ-Банк
www.rrb.by
**ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Акционерный банк реконверсии и развития»**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2012 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.10.2012 | на 01.10.2011 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 41 601,7 | 26 680,6 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 363 790,3 | 206 703,6 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 16 936,7 | 76 711,1 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 358 828,9 | 337 766,0 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 124 515,2 | 62 683,1 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 25 128,7 | 12 192,7 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 5 435,1 | 5 438,5 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 8 772,5 | 5 295,7 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 945 009,1 | 733 471,3 |
| 14 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 109 108,6 | 107 983,2 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 89 186,2 | 126 076,5 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 569 387,7 | 359 759,7 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 30 616,4 | 33 851,7 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 12 211,1 | 5 927,5 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 6 160,1 | 1 391,8 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 816 670,1 | 634 990,4 |
| 22 | КАПИТАЛ | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 55 768,7 | 55 768,7 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 3 520,5 | 3 520,5 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 15 195,0 | 2 255,2 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 53 854,8 | 36 936,5 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 128 339,0 | 98 480,9 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 945 009,1 | 733 471,3 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2012 года**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.10.2012 | на 01.10.2011 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 72 330,2 | 42 867,9 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 51 519,4 | 27 711,7 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 20 810,8 | 15 156,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 40 020,1 | 26 733,2 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 873,5 | 1 552,8 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 38 146,6 | 25 180,4 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (44,4) | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 8 866,7 | (75 034,2) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (1 680,6) | 78 893,2 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 12 644,5 | 7 651,8 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 5 462,8 | 3 669,9 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 40 745,7 | 23 702,3 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4 584,5 | 2 270,6 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 13 587,2 | 14 240,8 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 1 579,0 | 2 754,5 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 12 008,2 | 11 486,3 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | |

**Председатель Правления** **Ю.Г. Мартынов**
**И.о. Главного бухгалтера** **Т.И. Карчмит**
**Дата подписания «10» октября 2012 г.**

*Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 21 от 31.01.2008. УНП 100361187.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Борисовском райисполкоме (продавец),**
**проводит повторный открытый аукцион по продаже гаража на 6 боксов,**
**инвентарный номер 610/С-2475, об. пл. 179,8 кв.м, расположенного по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Чаловской, 41.**

Начальная цена (снижена на 20%) – **138 100 140** бел. руб.

Объект обременен договором аренды (гараж, пл. 16,4 кв.м по 31.03.2013).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентам РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентам РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона на расчетный счет организатора торгов.

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 13.07.2012.*

Аукцион состоится **29.10.2012** в 12.15 по адресу: Минская обл., **г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.10.2012** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 324**.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

Утерянные представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №№ 0377365, 0377590, 0378627, 0379091, 0382930, 0382921 и по добровольному страхованию расходов граждан, выезжающих за границу формы 2РН, 2РП серии БР № 001968 **считать недействительными.** УНП 101883943

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0241741 **считать недействительным.** УНП 101883943

## ■ Да ведама

# РАКІ — ПАД ЗАБАРОНАЙ

**На ўсіх вадаёмах краіны з 15 кастрычніка па 15 ліпеня забараняецца лоўля вузкапалага рака. У выпаду вылаву ракаў, згодна з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, рыбалоў абавязаны адпусціць іх у вадаём.**

— Акрамя таго, варта памятаць, што бліжэйшы сваяк вузкапалага рака — рак шыракапалы, які даволі рэдка сустракаецца ў беларускіх вадаёмах і занесены ў рэспубліканскую Чырвоную кнігу. Яго лоўля катэгарычна забаронена. Адрозніць гэтыя два віды ракаў дастаткова лёгка: шыракапалы, у параўнанні з вузкапалым, мае больш кароткія і тоўстыя клюшні, — нагадаў старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Варабей.

Згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь «Аб адміністрацыйных правапарушэннях», за парушэнне Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства прадугледжаны штраф у памеры ад 10 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй прылад здабычы рыбы ці іншых водных жывёл і іншых прадметаў, якія сталі прыладай ці сродкам здзяйснення ўказанага парушэння.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ И ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ в г. Лида

**Аукцион состоится в 12.00 15 ноября 2012 г. в г. Лида Гродненской обл. по ул. Советской, 8.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 9 ноября 2012 г. до 15.00.**
**Телефон для справок: 41 98 32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: www.ino.by**

| **Номер лота** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
|---|---|---|---|---|---|
| **Адрес земельного участка, кадастровый номер** | г. Лида, ул. Волгоградская, У-1154 423650100006001125 | г. Лида, 2-й пер. Свердлова, У-1157 423650100005000947 | г. Лида, 2-й пер. Свердлова, У-1158 423650100005000948 | г. Лида, ул. Речная, У-1159 423650100005000946 | г. Лида, ул. Рыбацкая, У-1160 423650100005000945 |
| **Целевое назначение земельного участка** | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| **Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества** | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) |
| **Право на земельный участок** | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности |
| **Площадь, га** | 0,1347 | 0,1499 | 0,1085 | 0,1001 | 0,1140 |
| **Форма участка** | четырехугольная | четырехугольная | четырехугольная | четырехугольная | четырехугольная |
| **Рельеф участка** | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный |
| **Расположение земельного участка** | земельный участок расположен в северо-западной части города | земельный участок расположен в северо-восточной части города | земельный участок расположен в северо-восточной части города | земельный участок расположен в северо-восточной части города | земельный участок расположен в северо-восточной части города |
| **Расположение участка в массиве застройки** | угловой | не угловой | угловой | не угловой | не угловой |
| **Транспортная доступность** | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Гастелло автобус № 7 приблизительно составляет 630 м | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Свердлова автобус № 3 приблизительно составляет 500 м | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Свердлова автобус № 3 приблизительно составляет 480 м | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Свердлова автобус № 3 приблизительно составляет 300 м | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Свердлова автобус № 3 приблизительно составляет 350 м |
| **Инженерная инфраструктура** | существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газопровод, водопровод, канализация, теплоснабжение с условиями | существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газопровод с условиями | существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газопровод с условиями | существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газопровод, водопровод с условиями | существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газопровод, водопровод с условиями |
| **Экологическое состояние** | благоприятное | благоприятное | благоприятное | благоприятное | благоприятное |
| **Наименование ограничений в праве** | в охранных зонах линий электропередачи площадью 0,0051 га | в водоохранных зонах водных объектов 0,1499 га | в водоохранных зонах водных объектов 0,1085 га | в охранных зонах линий электропередачи площадью 0,0010 га | НЕТ |
| **Начальная цена земельного участка, руб.** | 99 348 928 (девяносто девять миллионов триста сорок восемь тысяч девятьсот двадцать восемь) рублей | 61 646 225 (шестьдесят один миллион шестьсот сорок шесть тысяч двести двадцать пять) рублей | 44 620 517 (сорок четыре миллиона шестьсот двадцать тысяч пятьсот семнадцать) рублей | 62 717 155 (шестьдесят два миллиона семьсот семнадцать тысяч сто пятьдесят пять) рублей | 71 426 130 (семьдесят один миллион четыреста двадцать шесть тысяч сто тридцать) рублей |
| **Задаток, руб.** | 9 934 890 | 6 164 620 | 4 462 050 | 6 271 720 | 7 142 610 |
| **Дополнительное условие** | возместить затраты: за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 3 040 934 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка 490 000 рублей | возместить затраты: за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 3 443 748 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка 490 000 рублей; | возместить затраты: за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 3 196 495 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка 490 000 рублей | возместить затраты: за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 3 129 262 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка 490 000 рублей | возместить затраты: за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 3 330 753 рубля, за государственную регистрацию создания земельного участка 470 000 рублей |

| **Номер лота** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** |
|---|---|---|---|---|---|
| **Адрес земельного участка, кадастровый номер** | г. Лида, ул. 5 Декабря, У-184 423650100005000949 | г. Лида, микрорайон «Молодежный», У-1107 423650100003001189 | г. Лида, микрорайон «Молодежный», У-1124, 423650100003001199 | г. Лида, микрорайон «Молодежный», У-1125, 423650100003001198 | г. Лида, микрорайон «Молодежный», У-1126, 423650100003001197 |
| **Целевое назначение земельного участка** | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| **Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества** | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) |
| **Право на земельный участок** | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности | Право частной собственности | Право частной собственности |
| **Площадь, га** | 0,1045 | 0,1001 | 0,1000. | 0,1000. | 0,1000. |
| **Форма участка** | четырехугольная | пятиугольная | четырехугольная | четырехугольная | четырехугольная |
| **Рельеф участка** | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный |
| **Расположение земельного участка** | земельный участок расположен в северо-восточной части города | земельный участок расположен в северо-западной части города | земельный участок расположен в северо-западной части города | земельный участок расположен в северо-западной части города | земельный участок расположен в северо-западной части города |
| **Расположение участка в массиве застройки** | не угловой | Угловой | Не угловой | Не угловой | Не угловой |
| **Транспортная доступность** | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул.Свердлова автобус № 3 приблизительно составляет 500м | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Строителей автобус № 7 приблизительно составляет 350 м | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Строителей автобус № 7 приблизительно составляет 425 м | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Строителей автобус № 7 приблизительно составляет 400 м | расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Строителей, автобус № 7 приблизительно составляет 375 м. |
| **Инженерная инфраструктура** | существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газопровод, водопровод, канализация с условиями | в стадии проектирования | в стадии проектирования | в стадии проектирования | в стадии проектирования |
| **Экологическое состояние** | Благоприятное | благоприятное | благоприятное | благоприятное | благоприятное |
| **Наименование ограничений в праве** | в охранных зонах линий электропередачи площадью 0,0330 га в охранных зонах сетей и сооружений канализации площадью 0,0112 га в водоохранных зонах водных объектов площадью 0,1045 га | НЕТ | НЕТ | НЕТ | НЕТ |
| **Начальная цена земельного участка, руб.** | 52 098 475 (пятьдесят два миллиона девяносто восемь тысяч четыреста семьдесят пять) рублей | 35 946 611 (тридцать пять миллионов девятьсот сорок шесть тысяч шестьсот одиннадцать) рублей | 35 910 700 (тридцать пять миллионов девятьсот десять тысяч семьсот) рублей | 35 910 700 (тридцать пять миллионов девятьсот десять тысяч семьсот) рублей | 35 910 700 (тридцать пять миллионов девятьсот десять тысяч семьсот) рублей |
| **Задаток, руб.** | 5 209 850 | 3 594 660 | 3 591 070 | 3 591 070 | 3 591 070 |
| **Дополнительное условие** | возместить затраты: за государственную регистрацию создания земельного участка 530 000 рублей | возместить затраты: за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 рублей; по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 335 690 рублей | возместить затраты: за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 рублей; по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 335 690 рублей | возместить затраты: за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 рублей; по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 335 690 рублей | возместить затраты: за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 рублей; по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 335 690 рублей |

# «ЗЯЛЁНЫЯ» ПРАВІЛЫ ДЫЗАЙНУ

**Што б вы зрабілі, калі б атрымалі вялізную суму грошай? Паехалі б у адпачынак на самы дарагі курорт, купілі б новенькі аўтамабіль і адразу звольніліся б з працы?.. А калі б гэтыя грошы далі гэтай дзяўчыне, яна пабудавала б праз увесь горад зялёны шлях. Каб людзі маглі па ім гуляць, адпачываць і проста ісці, куды ім трэба. І ніякіх табе машын! Гэту дзяўчыну завуць Яна Марчук. З дзяцінства яна любіла блукаць па палях, лугах і балотах. А сёння азеляненне прасторы — ландшафтны дызайн — гэта яе прафесія.**

## ДОМА ЯК... ДОМА

Яна распавядае, з чаго трэба пачынаць аздабленне і азеляненне тэрыторыі каля свайго дома:

— Перад тым, як купіць стос глянцавых часопісаў па стварэнні ландшафту, трэба падумаць: навошта вам патрэбны гэты ўчастак і як вы будзеце яго выкарыстоўваць? І прыслухацца да сябе. Вельмі шмат людзей, наглядзеўшыся на прыгожыя ўчасткі суседзяў або ўбачыўшы штосьці цікавае па тэлебачанні, пачынаюць марыць пра «такую самую прыгажосць». Але яны забываюць, што на сваёй прасторы трэба захоўваць адчуванне дому і камфорту — гэта вельмі важна.

Трэба прадумаць, што будзе на падворку, што дакладна патрэбна, а што не, якая там павінна прысутнічаць атмасфера і колькі намаганняў чалавек гатовы для гэтага прыкласці? Хоча ён проста адпачываць або гатовы зноў і зноў працаваць над сваім садам? Толькі пасля гэтага можна пачаць набываць матэрыялы і нешта будаваць.

## НУ, ЗА ЭКАЛАГІЧНАСЦЬ!

Яна Марчук расказала і пра тое, што зараз найбольш актуальна ў стварэнні ландшафтаў:

— Сучасны ландшафтны дызайн устойлівы і экалагічны. Выкарыстоўваюцца тыя раслінныя формы і аб'екты, якія патрабуюць найменшага догляду. Гэта звычайныя расліны мясцовай флоры, яны і выглядаюць адпаведна — даволі звыкла. Бяруцца, у асноўным, натуральныя матэрыялы. Атрымліваюць распаўсюджванне і экалагічныя энерганосьбіты, з дапамогай якіх здабываюць альтэрнатыўныя віды энергіі. Усё гэта фарміруе новы экастыль — так званы ўстойлівы ландшафтны дызайн.

Тут жа можна прыгадаць і зялёныя дахі, зялёныя сцены — раней азеляненне з такой мэтай не выкарыстоўвалася. Для падтрымання экалагічнасці таксама выкарыстоўваюцца розныя сістэмы збору дажджавой вады.

## ПАРК, ЯКІ ЖЫВЕ

Яна мае ўласнае бачанне ландшафтнага дызайну ў Беларусі:

— Нам ёсць над чым працаваць. Найперш гэта датычыцца гарадской прасторы. У нас ёсць надзвычай добрая база: нашы паркі — сапраўдныя зялёныя кліны ў межах гарадоў. Аднак што датычыцца прыстасаванасці зялёных зон для жыхароў, тут ўсё не так добра, як хацелася б.

Парк Перамогі каля Камсамольскага возера ў сталіцы — гэта, на маю думку, найлепшы прыклад удалага ландшафтнага дызайну. Ён найбольш жывы, сацыяльны. Там і веладарожка, і іншыя ўмовы для адлюстравання актыўнасці чалавека. Там праходзяць розныя акцыі, перфомансы, па нядзелях адбываюцца танцы. Ты прыходзіш туды і адчуваеш, што парк жыве. Людзі сапраўды адпачываюць і атрымліваюць пазітыўныя эмоцыі. Мы і працуем для таго, каб стварыць чалавеку асяроддзе для адпачынку.



**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,**
**фота з асабістага архіва Яны МАРЧУК.**

| Номер лота | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
|---|---|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | г. Лида, микрорайон «Молодежный», У-1127, 423650100003001196 | г. Лида, микрорайон «Молодежный», У-1128, 423650100003001195 | г. Лида, микрорайон «Молодежный», У-1129, 423650100003001194 | г. Лида, микрорайон «Молодежный», У-1130, 423650100003001193 | г. Лида, микрорайон «Молодежный», У-1131, 423650100003001192 |
| Целевое назначение земельного участка | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) |
| Право на земельный участок | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности |
| Площадь, га | 0,1000 | 0,1179 | 0,1139. | 0,1023 | 0,1179 |
| Форма участка | четырехугольная | пятиугольная | пятиугольная | пятиугольная | пятиугольная |
| Рельеф участка | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный |
| Расположение земельного участка | земельный участок расположен в северо-западной части города | земельный участок расположен в северо-западной части города | земельный участок расположен в северо-западной части города | земельный участок расположен в северо-западной части города | земельный участок расположен в северо-западной части города |
| Расположение участка в массиве застройки | Не угловой | Угловой | Угловой | Угловой | Угловой |
| Транспортная доступность | расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Строителей, автобус № 7 приблизительно составляет 350 м | расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Строителей, автобус № 7 приблизительно составляет 325 м | расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Строителей, автобус № 7 приблизительно составляет 300 м | Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Строителей, автобус № 7 приблизительно составляет 325 м | Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Строителей, автобус № 7 приблизительно составляет 325 м |
| Инженерная инфраструктура | в стадии проектирования | в стадии проектирования | в стадии проектирования | в стадии проектирования | в стадии проектирования |
| Экологическое состояние | благоприятное | благоприятное | благоприятное | благоприятное | благоприятное |
| Наименование ограничений в праве | НЕТ | НЕТ | НЕТ | НЕТ | НЕТ |
| Начальная цена земельного участка, руб. | 35 910 700 (тридцать пять миллионов девятьсот десять тысяч семьсот) рублей | 42 338 715 (сорок два миллиона триста тридцать восемь тысяч семьсот пятнадцать) рублей | 40 902 287 (сорок миллионов девятьсот две тысячи двести восемьдесят семь) рублей | 36 736 646 (тридцать шесть миллионов семьсот тридцать шесть тысяч шестьсот сорок шесть) рублей | 42 338 715 (сорок два миллиона триста тридцать восемь тысяч семьсот пятнадцать) рублей |
| Задаток, руб. | 3 591 070 | 4 233 870 | 4 090 230 | 3 673 650 | 4 233 870 |
| Дополнительное условие | возместить затраты:<br>за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 рублей;<br>по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 335 690 рублей | возместить затраты:<br>за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 рублей;<br>по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 335 690 рублей | возместить затраты:<br>за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 рублей;<br>по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 335 690 рублей | возместить затраты:<br>за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 рублей;<br>по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 335 690 рублей | возместить затраты:<br>за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 рублей;<br>по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 335 690 рублей |

| Номер лота | 19 |
|---|---|
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | г. Лида, ул. Машерова-ул. Фурманова, У-1150, 423650100011001452 |
| Целевое назначение земельного участка | для строительства административно-производственного здания |
| Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | для размещения объектов административного назначения |
| Право на земельный участок | право заключения договора аренды сроком на 10 лет |
| Площадь, га | 0,6833 |
| Форма участка | неправильная |
| Рельеф участка | равнинный |
| Расположение земельного участка | земельный участок расположен в южной части города |
| Расположение участка в массиве застройки | угловой |
| Транспортная доступность | расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Фурманова, автобус № 8 приблизительно составляет 50 м |
| Инженерная инфраструктура | существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газ, водопровод, канализация, теплосети с условиями |
| Экологическое состояние | благоприятное |
| Наименование ограничений в праве | ограничение права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0450 га в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,0704 га в охранных зонах линий электропередачи, площадью 0,1252 га в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадью 0,2052 га в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадью 0,0721 га в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения. |
| Начальная цена земельного участка, руб. | 327 295 234 (триста двадцать семь миллионов двести девяносто пять тысяч двести тридцать четыре) рубля |
| Задаток, руб. | 32 729 520 |
| Дополнительное условие | возместить затраты:<br>за проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 4 029 023 рубля;<br>за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него в сумме 420 000 рублей |

Условия проведения аукциона в части продажи земельных участков в частную собственность.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения, формированием земельного участка, государственной регистрацией создания земельного участка;

осуществить в двухмесячный срок государственную регистрацию прав, ограничений прав на земельный участок;

получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;

приступить к занятию земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него.

К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявление в соответствии с действующим законодательством.

Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь.

Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 5%.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;

копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или доверенного лица;

доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность

Условия проведения аукциона в части продажи права аренды земельных участков.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

заключить с Лидским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав, ограничений прав на земельный участок;

получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта;

завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;

за нарушение сроков строительства взимается пеня в размере из расчета 1/2 ставки рефинансирования Национального банка (годовых) от стоимости строительства за каждый день просрочки.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копии учредительных документов;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе).

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя - доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Номер р/с для перечисления задатка для участия в аукционе по продаже земельных участков в частную собственность и по продаже права аренды земельных участков – р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

*Нашшшыны :)*

**Калі за акном (дый у доме таксама) робіцца ўсё халадней, міжволі шукаеш, як сагрэцца — тоўсты плед, гарачая кава або цёплыя ўспаміны. Вось і мы прапануем для разагрэву гарачыя тэмы гэтай восені.**

## УСЕ ЛЮБЯЦЬ КОЦІКАЎ

Гэта аксіёма віртуальнай прасторы. Варта толькі вывесіць фотку ката ў блогу ці сацыяльнай сетцы, як атрымліваеш процьму ўвагі, каментарыяў і «лайкаў». Бо мала хто можа ўстрымацца, каб не захапіцца гэтымі мілымі істотамі. Дый віртуальнае кацянё «пагладзіць» — шмат высілкаў не трэба, гэта вам не бяздомнага ката шторанiцы за тры прыпынкі бегаць карміць.



Але сёлета інфармацыйная актыўнасць коцікаў, бадай, рэкордная за некалькі апошніх гадоў: што ні дзень, то новы хвастаты ньюсмейкер прыцягвае ўвагу СМІ і грамадскасці. Так, не паспелі заціхнуць страсці вакол звальнення з пасады Лары — нядбайнага афіцыйнага мышалова пры брытанскім прэм'ер-міністры, — як шведская паліцыя арыштавала іншага кацяру за крадзеж прадуктаў. Праз некалькі дзён глядзім сайт навін — а там «кацінае» паведамленне: Маскоўскі заапарк зноў выбраў у якасці свайго талісмана дзікага ката манула (падобны да хатняга, але з больш кароткімі нагамі і масіўным тулавам), які ў інтэрнэт-галасаванні наведнікаў з вялікім адрывам апярэдзіў вожыка, белае медзведзяня, тыграня і іншых кандыдатаў. Тым часам касавокі кот Спанглс з Паўднёвай Караліны, ЗША, стаў новай інтэрнэт-сенсацыяй дзякуючы гаспадыні, якая апранула ўлюбёнца ў разнастайныя забаўныя касцюмы, сфатаграфавала і размясціла фота на адмысловай старонцы ў Facebook. І гэта яшчэ што — днямі ва Уладзімірскай вобласці РФ актывісты — абаронцы правоў дольшчыкаў — запусцілі ката Лаўку на паветраным шары ў стратасферу з тым, каб... прыцягнуць увагу прэзідэнта. Вымушаны паветраплавальнік сядзеў у баракамеры з цыдулкай «Паважаны У.У.Пуцін. Дапамажыце дабудаваць мой домік», і праз пару гадзін, як сцвярджаюць актывісты грамадскага руху, прызямліўся, здаровенькі, у 200 км ад месца запуску.

Карацей, вы зразумелі тэндэнцыю? Ні дня без ката! Гэта першы мой запавет. А другі — прыцягваючы ўвагу, славу ці шанцаванне да сябе, любімых, не забывайцеся ўсё ж пра адказнасць перад тымі, каго прыручылі...

## ГЭТЫ СПРЭЧНЫ «ЗІМОВЫ» ЧАС

Год таму Беларусь, як і Расія, адмовілася ад пераходу на «зімовы» час (калі нехта ўсё праспаў, на ўсякі выпадак нагадваем: 28 кастрычніка пераводзіць стрэлкі на гадзіну назад НЕ ТРЭБА). Але канчатковым гэтае рашэнне назваць не выпадае — вучоныя і медыкі, псіхолагі і энергетыкі дагэтуль спрачаюцца, у чым плюсы і мінусы.

Напрыклад, паводле вераснёўскага ўсерасійскага апытання, прыхільнікаў адмены «зімовага» часу налічваецца ўсяго 35% — удвая менш, чым летась. Трэцяя частка апытаных ставіцца да адмены негатыўна, яшчэ трэць сцвярджае, што ім усё адно. Гэткі ж разброд і хістанне назіраецца вакол ініцыятывы зрабіць «зімовы» час пастаянным — моладзь ва ўзросце да 30 гадоў пераважна задавальняе цяперашні, «летні» варыянт, у той час як расіяне ва ўзросце 45 гадоў і старэй аддаюць перавагу «зімоваму».

У нашай краіне вяртанне да «зімовага» часу пакуль што не абмяркоўваецца, але на ўсякі выпадак медыкі і энергетыкі запэўніваюць сугрмадзян — ні на эканомію электрычнасці, ні на здароўе людзей «лішняя» гадзіна істотна не паўплывае. І ўсё адно згуртаванасці ў гэтым пытанні няма — адным цяжка ўставаць зацемна, другім элементарна страшна ў прыцемках вяртацца з працы, трэція ўпадаюць у дэпрэсію пры кожным пераводзе стрэлак гадзінніка.

Са свайго боку, ініцыятыву ўсталяваць пастаянны «летні» час кагарычна падтрымліваю. З дадаткам у выглядзе пастаяннай летняй тэмпературы — хоць бы ў кватэрах. А да кучы — гуляць дык гуляць! — прапаную адмяніць будзільнікі і панядзелкі.

## НА ФУТБОЛ БЫ Я ПАЙШОЎ... ДЫ ГРОШАЙ НЕ ХОПІЦЬ?

Адразу некалькі рэсурсаў паведамілі: футбольны матч Беларусь — Іспанія (адбудзецца ў Мінску 12 кастрычніка) выклікаў у беларусаў у некалькі разоў меншую цікавасць, чым канцэрт эпатажнага Мэрыліна Мэнсана (запланаваны на 21 снежня). Так, з 34 тысяч месцаў на стадыёне «Дынама» заўзятары выкупілі ўсяго 1690, альбо 5%, у той час як з 5 тысяч білетаў на Мэнсана разышліся ўжо больш за 1720, альбо 34%. І гэта пры немаленькай розніцы ў цане: кошт футбольных квіткоў вагаецца ад 280 да 480 тысяч рублёў, музычных — ад 320 да 700 тысяч.



Як каго, а мяне гэта навіна вельмі збянтэжыла. Няўжо чэмпіёны свету па футболе каціруюцца ў беларускіх балельшчыкаў так нізка, а Мэнсан у... нават няёмка пісаць, меламанаў — так высока? Дык і вераснёўскі канцэрт Джэніфер Лопес з квіткамі ад 400 тысяч да 1,5 мільёна быў аншлагавым, і на прэзентацыю новага альбома канадскіх рок-зорак Nickelback, што мае адбыцца 31 кастрычніка, квіткі коштам ад 410 тысяч да 1,8 млн актыўна разбіраюцца, і клубны канцэрт Паліны Гагарынай з квіткамі ў 250—800 тысяч шмат каго зацікавіў.

Можна прывесці мноства аргументаў. Скажам, што на футбольныя матчы і на канцэрты ходзяць розныя людзі. Што цэнавая палітыка бізнэсменаў ад спорту — прадаваць квіткі пакетам, адразу на некалькі гульняў — далёка не ўсім падабаецца, у сувязі з чым гучаць заклікі байкатаваць матчы. Але ж... Прапаноў хапае, а попыт такі розны. Яно, безумоўна, радуе, што музыка ў трэндзе. Але сітуацыя з футболам засмучае. І зусім сумна робіца ад таго, што немалая колькасць беларусаў не зможа сабе дазволіць ні музычнага, ні футбольнага шоу. Бо ў пірамідзе патрэб першым стаіць хлеб, і толькі напрыканцы — відовішчы...

**Дзяжурыла па сеціве Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# ЗАХАВАЛЬНІК МАНЕТНАЙ ГІСТОРЫІ

**Многія лічаць, што манета — гэта толькі злітак металу пэўнай формы, вагі і пробы. Але толькі сапраўдныя нумізматы і знаўцы манетнага мастацтва бачаць у такім кавалачку металу гісторыю пэўнай дзяржавы, адчуваюць подых мінулых часоў, чароўны бляск і загадку стагоддзяў. У першую чаргу манеты служылі і служаць да гэтага часу ўзаконеным сродкам абарачэння. Аднак быў у гісторыі цудоўны момант, калі іх пачалі чаканіць не толькі для рэгулярнага абарачэння ў выглядзе сродкаў для аплаты, але і «на памяць». Былі манеты «на смерць», «на адпушчэнне грахоў», «на дзень нараджэння», «пфеніг ката з Гамбурга» — манета, якую ўручаў кат суддзі пры сыходзе ў адстаўку, «на наведванне манетных двароў» і іншыя.**



Цяга збіраць манеты ў мінчаніна Мікалая Васільева з'явілася яшчэ ў дзяцінстве. Яму было каля дзесяці гадоў, калі ў сваю скарбонку ён сабраў з дапамогай бацькоў першую калекцыю савецкіх манетак. Для дзіцяці гэта быў вялікі крок. Дзякуючы закладзенаму падмурку, жаданне рухацца далей толькі расло, і цяпер у яго калекцыі прысутнічаюць экзэмпляры манет не толькі з бліжэйшых краін...

— У калекцыянераў-пачаткоўцаў заўсёды ёсць самыя распаўсюджаныя манеты, — расказвае Мікалай. — Напрыклад, манеты часоў Савецкага Саюза, манеты Цэнтральнай Еўропы другой паловы XX стагоддзя, сучасныя манеты розных краін. Апошнія знаходзяцца ў абарачэнні, таму дастаць іх для сваёй калекцыі зусім не праблема. Асабліва калі часта падарожнічаеш. А вось калі ў калекцыянера ёсць манеты, напрыклад, з Югаславіі, дзяржавы, якая ўжо не існуе, або Карэі XIX стагоддзя, такога чалавека смела можна назваць прафесіяналам.

**— Калекцыянаванне манет даволі скрупулёзная справа. Трэба ведаць, дзе і ў каго шукаць патрэбны экзэмпляр. А якім чынам папаўняецца ваша калекцыя? Дзе вы знаходзіце патрэбныя манеты?**

— Спосабаў набыць манеты існуе шмат. Па-першае, трэба патэлефанаваць і спытаць ва ўсіх сваіх сяброў, сваякоў, аднагрупнікаў, калег, ці ёсць у іх манеты. Гэты спосаб адзін з самых простых, таму што манеткі часцяком набываеш толькі за «дзякуй». Па-другое, у інтэрнэце ёсць шмат сайтаў, прысвечаных нумізматыцы. Таксама можна выставіць манеты на аўкцыён, зарабіўшы на гэтым нямала грошай. Безумоўна, цана залежыць ад запатрабаванасці манет.

**— Якія з усіх манет маюць для вас асаблівае значэнне і чаму?**

— Сярод сямі калекцыйных манет наміналам «адзін рубель», якія былі выпушчаныя ў Савецкім Саюзе, ёсць манета з выявай Льва Мікалаевіча Талстога. Яна дасталася мне ад маёй цёткі, настаўніцы рускай мовы і літаратуры. Гэта быў падарунак ад аднаго з вучняў. Відаць, як добры жэст на шляху да жаданай адзнакі *(усміхаецца)*. Яшчэ мне вельмі падабаюцца польскія грошы і злотыя. Не ведаю, чаму, проста прыцягваюць. Таксама цікавае афармленне ў іспанскіх і італьянскіх манет.

Ёсць у калекцыі Мікалая і «экзатычныя» манеты: з Ямайкі, Кайманавых астравоў, Панамы, Мексікі, Эквадора, з астравоў Трынідад і Табага, Інданезіі, Саудаўскай Аравіі, Дамініканскай Рэспублікі... З такой шыкоўнай калекцыяй цяжка трымаць усю інфармацыю ў галаве. Таму Мікалай вядзе каталог, дзе пазначае ўсю сваю «наяўнасць». Яна для яго — не проста прыгожа адлітыя «кавалкі» металу, а подых мінулых часоў.

**Ганна БУРАК.**

# ГІСТОРЫКІ І ФІЛОЛАГІ — СУПРАЦЬ МАТЭМАТЫКАЎ!

**Які першакурснік не спрачаўся з іншымі на тэму, хто адыгрывае першую скрыпку: «гуманітарыі» ці «тэхнары»? А вось у студэнтаў БДУ з'явілася ўнікальная магчымасць расставіць у гэтым пытанні ўсе кропкі над «і». Днямі ў пасёлку Шчомысліца адбыўся «Кубак першакурсніка БДУ», які сабраў студэнтаў-пачаткоўцаў з 13 факультэтаў галоўнага ўніверсітэта краіны. Арганізатарам спартыўна-творчага спаборніцтва выступіў камітэт БРСМ БДУ.**




Чаго толькі не зробіш дзеля перамогі...

— Прызнаемся, што адной з нашых мэтаў было імкненне пазнаёміць першакурснікаў з дзейнасцю БРСМ, — расказаў сакратар камітэта БРСМ БДУ Сяргей Клішэвіч. — Да таго ж конкурс — гэта яшчэ і выдатная магчымасць для нас вызначыць сярод студэнтаў будучых лідараў.

Спаборніцтвы такога кшталту ладзіліся ў БДУ упершыню. Для ўдзелу ў «Кубку першакурснікаў» кожны факультэт выставіў адну каманду. Аптымістычны настрой удзельнікаў адчуваўся яшчэ ў перапоўненым аўтобусе. Ехалі пад вясёлы смех і гучныя спевы. Таму на першы этап — «Турыстычную сцежку» — першакурснікі пайшлі з бадзёрым настроем і вялізным жаданнем перамагчы. Там іх чакала арыентаванне па мясцовасці, пераадоленне перашкод, інтэлектуальныя конкурсы, а таксама «тэст» на згуртаванасць.

Другая частка конкурсу насіла творчы характар. Тэму спаборніцтва («Я — Студэнт БДУ!») кожная каманда раскрыла па-рознаму. Так, гістфак паказаў касцюміраваную сцэнку. Па-сапраўднаму «запалілі» публіку «вайскоўцы» і «ДЗІКСТаўцы» .

Па выніках двух конкурсаў пераможцам стаў гістарычны факультэт БДУ. Менавіта да іх упершыню патрапіў Кубак першакурсніка. На другім месцы размясціліся «навабранцы» з філалагічнага факультэта, а апошнюю прыступку п'едэстала падзялілі два факультэты — прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і Дзяржаўны Інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій.

Самае смешнае, што спрэчка паміж «фізікамі» і «лірыкамі» так і не вырашылася. На гэты раз «гуманітарыі» прадэманстравалі выдатную спартыўную падрыхтоўку і веды, а «тэхнары» — крэатыўнасць і высокую згуртаванасць. Але арганізатары нагадалі, што кубак кожны год будзе змяняць сваіх уладальнікаў. Цікава, да каго ён трапіць у наступны раз?

**Вікторыя ЧАПЛЕВА, студэнтка 1 курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.
Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 26.149.
Нумар падпісаны ў 19.30 10.10.2012 г.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27. № 29 (451)

# ШТО РАБІЦЬ У КАСТРЫЧНІКУ?

**Кастрычнік — час лістападу. У гэтым месяцы працягваюць выкопваць гладыёлусы, мантбрэцыі, каны. Апалае лісце збіраюць у кучы, але не спальваюць — выкарыстоўваюць для ўкрыцця раслін, пасадак і пасеваў на зіму, а таксама для падрыхтоўкі ліставой зямлі, перагною.**

Абразаюць амаль да зямлі сцёблы шматгадовых раслін, пакідаючы пянькі 2-4 см. Глебу вакол іх мульчыруюць кампостам. У залежнасці ад умоў надвор'я пачынаюць укрываць цеплалюбныя расліны.

Парасткі клематысаў здымаюць з апор, скручваюць кольцам і ўкладваюць на зямлю.

## КВЕТКІ ДОМА

Большасць пакаёвых раслін пераходзіць у стан супакою. Паліваюць іх значна радзей і да вясны не падкормліваюць. Расліны, якія цвітуць, працягваюць умерана паліваць.

З пачаткам ацяпляльнага сезона паліў пакаёвых раслін даводзіцца павялічыць, асабліва ў пакоях з паўднёвага боку. Для павышэння вільготнасці паветра ў пакоі на батарэі ўсталёўваюць ёмістасці з вадой ці сырым пяском, уключаюць адмысловыя ўвільгатняльнікі, фантанчыкі.

Многія вазонныя культуры часова затармажваюць рост. Расліны, якія працягваюць рост, маюць патрэбу ў добрым асвятленні, каб парасткі не выцягваліся. Дапамагчы вазонам перажыць гэтыя неспрыяльныя месяцы можна паменшыўшы паліванне, часцей апырскваючы лісце і не забываючы рыхліць паверхню глебы.

## У ГАРОДЗЕ

Раслінныя рэшткі пасля ўборкі морквы, буракоў і іншай агародніны выкарыстоўвайце для падрыхтоўкі кампоставай кучы. Пашкоджанае фітафторай бацвінне бульбы, таматаў, баклажанаў высушыце асобна і спаліце.

У сярэдзіне месяца ўбярыце позня гатункі белакачанай капусты, зімовай рэдзькі. Калі вы перакопваеце свой участак увосень, унясіце пры перакопцы перагной, кампост і фосфарна-калійныя ўгнаенні, а таксама драўняны попел і даламітавую муку. Глебу пасля ўзворвання не культывуйце і не барануйце. Узімку на неразбітых камах затрымліваецца больш снегу, а пры моцных маразах у іх хутчэй гінуць шкоднікі.

Можна паспрабаваць і іншыя спосабы падрыхтоўкі глебы да наступнага сезона.

Зрабіце падзімовы пасеў культур, якія вы хочаце вырошчваць для спажывання ранняй вясной. Прадэзынфікуйце цяпліцы і парнікі, не занятыя гароднінай.

## У САДЗЕ

У першай палове месяца пажадана скончыць пасадку дрэў і ягадных кустоў. І пачаць рыхтаваць сад да зімы. У канцы кастрычніка маладыя дрэвы абвяжыце яловым лапнікам (абавязкова іголкамі ўніз) ці абгарніце мешкавінай ад грызуноў.

Ніз абвязкі акучце глебай на 10-15 см, каб мышы не прабраліся да ствала. Кроны маладых дрэў звяжыце, каб сецерагчы галіны ад паломаў пад цяжарам снегу. Маладыя дрэвы з гладкай карой бяліць не варта. Зніміце муміфікаваныя плады, зімовыя гнёзды і яйцакладкі шкоднікаў.

У ягадніках у канцы месяца выражце сухія, абламаныя і пашкоджаныя шкоднікамі і хваробамі галіны. Парасткі маліны зніміце са шпалеры і, прыхіліўшы да зямлі, прышпіліце ці звяжыце адзін з адным.

Праверце, як захоўваюцца плады ў склепе, адрыне ці гаражы.

# НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ

✓**Кастрычніцкі гром абяцае бясснежную зіму.**

✓Адлёт жураўлёў да Пакравоў (14 кастрычніка) — да доўгай зімы.

✓**З'яўленне камароў позняй восенню — да мяккай зімы.**

✓Калі снег выпадае, а ліст не спадае, то зіма лютая будзе.

✓**Восенькі іней — да сухога сонечнага надвор'я.**

✓Ліст з дрэва валіцца — рыба па рацэ цягнецца.

✓**Калі качка яшчэ сядзіць на вадзе і не ляціць нават у халодны дзень, то пагода яшчэ пратрымаецца доўга.**

✓З дрэва ліст ападае чыста — лёгка ўсяму: хлебу, людзям, скаціне.

✓**Ізноў з'явіліся грыбы — не чакай хуткага снегу.**

✓Пакуль з вішань ліст цалкам не апаў, колькі б снегу ні выпала — адліга яшчэ згоніць яго.

✓**Першы снег выпадае за 40 дзён да зімы.**

✓Зацяжная восень — ранняя вясна. Ранняя восень — позняя вясна.

✓**Калі сарока палезла пад страху, варта чакаць рэзкага пахаладання. Туліцца да жылля перад марозам і сініца.**

✓Калі ў зайцаў шмат тлушчу, зіма будзе працяглай.

✓**Калі гусі хаваюць дзюбы пад крыло — чакай хуткіх замаразкаў.**

✓Дваровы сабака цэлы дзень сонны — да непагадзі.

# ЗАНАТУЙЦЕ!

❍Варта вызначыцца, дзе ў наступным сезоне будуць расці гладыёлусы. Карысна пратруціць меркаванае месца пасадкі настоем хвоі. Гатуюць яго так: у эмаляваную каструлю трэба пакласці 2 кг хвоі, заліць 3 л вады, накрыць, паставіць на агонь і давесці да кіпення. Настойваць 5 сутак, затым хвою адціснуць і настой працадзіць. Глебу перакапаць і паліць настоем, які развесці вадой.

❍Калі неабходна вапнаваць глебу, то рабіце гэта адразу пасля ўборкі бульбы. А на тым участку, дзе налета будзе расці бульба, вапнаванне рабіць не трэба. Памятайце, што нельга адначасова ўносіць гной і вапну. Гэтыя звесткі вы знойдзеце ў любым добрым падручніку па аграхіміі.

# ЯК ЗАХОЎВАЦЬ МЁД

**З мёдам трэба ўмець абыходзіцца. Яго трэба правільна выбраць пры куплі, яго трэба ўмець захоўваць.**

Мёд варта захоўваць у чыстых, сухіх, без старонніх пахаў памяшканнях, абароненых ад прамых сонечных праменяў.

Не дапускаецца захоўванне мёду разам з атрутнымі прадуктамі і тымі, якія могуць надаць мёду не ўласцівы яму пах.

Тэрмін захоўвання мёду пры тэмпературы не вышэй за плюс 20°С і не ніжэй за мінус 5°С складае да двух гадоў у герметычна закрытай шкляной (пажадана цёмнай) ці драўлянай ёмістасці. Пры гэтым мёд можа пастувова загусцець і памутнець. Гэтыя працэсы сведчаць пра высокую якасць прадукту. Для захоўвання падыдуць ліпавыя, асінавыя бочкі. У дубовых бочках мёд можа пацямнець. У выпадку выкарыстання для захоўвання драўлянай ёмістасці, яна не павінна мець паху, бо мёд выдатна ўбірае ў сябе старонія пахі. Калі ў вас мёд стаіць побач з квашанай капустай, то смак можа змяніцца. Неабходна таксама ўлічваць, што пры працяглым захоўванні частка карысных рэчываў паступова разбураецца.

Не захоўвайце мёд у алюмініевым, жалезным, бляшаным, ацынкаваным посудзе, бо прадукт можа стаць атрутным.

Разаграваюць мёд, калі паўстала неабходнасць яго фасоўкі, пры тэмпературы ад 32 да 38 градусаў.

# З ЛУНІНЦА Ў СТОЛІН — НА ПАРОМЕ

## Новая пераправа скарацiла дарогу паміж райцэнтрамі ў чатыры разы

**Адлегласць паміж Столінам і Лунінцам складае ўсяго 40 кіламетраў. Але гарады раздзяляе шырокая Прыпяць. Некалі цераз раку быў мост у раёне вёскі Лахва. Ды ў вайну яго разбурылі. З той пары з аднаго райцэнтра ў другі можна было дабрацца толькі па чыгунцы.**

Дызель-цягнік ходзіць некалькі разоў на дзень. А аўтатранспарт вымушаны быў рабіць круг у адзін бок — праз Пінск, або ў другі — праз Жыткавічы Гомельскай вобласці. І так, і так дарога станавілася даўжэйшай больш чым у чатыры разы. Колькі лішняга паліва, часу ды іншых выдаткаў! А гэтыя палескія раёны заўсёды цесна супрацоўнічалі. І галоўнае, цярпелі людзі. Многія ўраджэнцы Лунінца знаходзілі працу, асядалі ў Століне, стваралі сем'і. І наадварот. У выхадныя наведаць родных было праблемай.

Амаль усе пасляваенныя гады і сталіцы, і лунінчане перыядычна звярталіся ў розныя інстанцыі з просьбамі пабудаваць пераправу цераз раку. Задумку ўдалося ажыццявіць дзякуючы Дзяржаўнай праграме развіцця Прыпяцкага Палесся. Праект каштаваў бюджэту 8,7 мільярда рублёў. Але справа таго вартая.

На будаўніцтва пераправы і плаўсродкаў спатрэбілася менш за год. Работу ажыццявілі спецыялісты прадпрыемства «Дняпроўска-Бугскі водны шлях». За гэты час з абодвух бакоў Прыпяці былі ўмацаваны берагі, узведзены прычальныя збудаванні, домікі для абслуговага персаналу, падведзены дарогі. А работнікі Пінскага суднарамонтна-суднабудаўнічага завода пабудавалі паром, капітальна адрамантавалі катар. Цяпер паром будзе хадзіць цераз Прыпяць штодзень. Яго грузапад'ёмнасць складае 60 тон. Адначасова разам з людзьмі на палубе могуць размясціцца 22 аўтамабілі.



На ўрачыстым адкрыцці парамнай пераправы старшыні Столінскага райвыканкама Рыгор Пратасавіцкі і Лунінецкага — Васіль Агіевіч падкрэслілі надзвычайную важнасць гэтай новай дарогі для развіцця раёнаў. Яна паспрыяе камфорту людзей, і — што самае важнае — эканамічнаму развіццю райцэнтраў і вёсак. Але дарога таксама павінна даць імпульс развіццю агратурызму.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# СКРАДЗЕНЫ ТРАКТАР ЗНАЙШЛІ Ў КЮВЕЦЕ

**Вечарам у Лепельскі раённы аддзел унутраных спраў з адміністрацыі акцыянернага таварыства паведамілі пра згон трактара.**

Высветлілася, што на ахоўнай тэрыторыі механізаванага двара ў вёсцы Сушча нехта залез у незамкнуты трактар «МТЗ-82» і паехаў. Ужо праз 40 хвілін трактар быў знойдзены. Праўда, знаходзіўся «жалезны конь» у кювеце аўтадарогі каля названай вёскі. Устаноўлена, што злачынства здзейсніў непрацуючы, раней судзімы за рабаванне тутэйшы жыхар 1987 года нараджэння. Адзначым, што злачынства раскрыта. Следчага камітэта заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


ВТБ

**ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)**

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14

Тел.: (+375 17) 309 15 15,
(+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2012 г.**

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 287 191,5 | 135 379,6 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 2 325 290,0 | 1 049 015,8 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 490 876,2 | 810 242,3 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 39 235,4 | 129 086,7 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 3 353 197,5 | 2 577 071,3 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 375 323,9 | 192 918,1 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 472,0 | 471,6 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 261 883,3 | 96 981,3 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 6 778,8 | 7 693,6 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 60 634,3 | 34 322,2 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 7 200 882,9 | 5 033 182,5 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 559 592,2 | 491 614,6 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 1 468 380,1 | 2 726 031,5 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 4 588 283,8 | 1 463 801,7 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 29 657,0 | 32 063,4 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 184,9 | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 88 043,3 | 33 221,1 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 6 734 141,3 | 4 746 732,3 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 84 370,2 | 84 370,2 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | 34 320,3 | 34 320,3 |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 16 891,6 | 16 891,6 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 131 755,5 | 22 512,5 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 199 404,0 | 128 355,6 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 466 741,6 | 286 450,2 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 7 200 882,9 | 5 033 182,5 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2012 г.**

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 548 668,0 | 229 396,7 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 414 908,9 | 131 365,0 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 133 759,1 | 98 031,7 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 197 710,9 | 75 435,4 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 29 684,8 | 18 933,9 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 168 026,1 | 56 501,5 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 1 577,2 | 5,0 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 16 858,3 | (192 713,0) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 26 487,2 | 233 618,0 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 78 322,2 | 58 196,8 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 9 854,4 | 11 182,8 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 170 788,6 | 70 367,4 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 12 964,5 | 7 020,6 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 94 487,0 | 71 041,2 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 4 195,6 | 14 499,9 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 90 291,4 | 56 541,3 |

**Председатель Правления** **В.В. Иванов**

**Главный бухгалтер** **М.В. Дудко**

**Дата подписания «08» октября 2012 г.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 17.05.2010 г. № 23, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 101165625*

КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» УНП 290433924

**18 октября 2012 года**

**ПРОВОДИТ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ ОАО «Ивацевичдрев»:**

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-1278 (служебно-бытовой корпус) площадью 4 094,3 кв.м (семиэтажное здание: фундамент свайный железобетонный, стены и перегородки кирпичные и гипсовые, железобетонные перекрытия, кровля рулонная совмещенная, год постройки 1983), расположенное по адресу: г. Брест, ул. Краснознаменная, д. 2. Начальная цена продажи **24 079 200 000 руб.**

Полная информация об аукционных торгах по тел.: **(0162) 23 81 92, (0162) 23 42 60.** Сайт: **bgcn.by, city.brest.by**

## ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

В соответствии с условиями договоров срочного банковского вклада (депозита) «Забота» ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении с 11 октября 2012 года до 36% годовых размера процентной ставки по договорам срочного банковского вклада (депозита) «Забота».

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 12 ноября 2012 года торгов по продаже единым комплексом имущества ОАО «Могилевоблресурсы»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | - контора (здание административно-хозяйственное общей площадью 188,7 кв. м, инвентарный номер 730/С-11877);<br>- тароремонтный цех (здание специализированное иного назначения общей площадью 516,2 кв. м, инвентарный номер 730/С-11880);<br>- навес (здание специализированное иного назначения общей площадью 343,6 кв. м, инвентарный номер 730/С-11878);<br>- навес (здание специализированное иного назначения общей площадью 298,4 кв. м, инвентарный номер 730/С-11879);<br>- покрытие проездов и площадей (сооружение неустановленного назначения общей площадью 4062 кв. м, инвентарный номер 730/С-13658);<br>- площадка для хранения тары (сооружение неустановленного назначения общей площадью 404 кв. м, инвентарный номер 730/С-13667);<br>- площадка для хранения тары (сооружение неустановленного назначения общей площадью 295 кв. м, инвентарный номер 730/С-13666);<br>- забор деревянный (сооружение неустановленного назначения общей площадью 157,6 кв. м, инвентарный номер 730/С-13655) |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер 724050100001004733, назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения, площадь – 0,9260 га |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Могилевская обл., г. Кричев, ул. Лермонтова, д. 37 |
| **Сведения о собственнике (продавце)** | ОАО «Могилевоблресурсы», ул. Залуцкого, 23, 212040, г. Могилев, телефон (0222) 47 84 25 |
| **Сведения об организаторе торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327 48 36 |
| **Начальная цена предмета торгов (с НДС)** | 129 400 320 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 12 000 000 белорусских рублей |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского Кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Могилевоблресурсы», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Вознаграждение за организацию и проведение аукциона уплачивается победителем торгов (покупателем) помимо оплаты стоимости приобретенного имущества.

Торги проводятся **12 ноября 2012 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 11.10.2012 по 08.11.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поступившие по истечении указанного срока, не рассматриваются.

**Телефоны для справок: (017) 327 48 36, (0222) 47 84 25.**

## ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»
## с 11 октября 2012 г.

| Сумма депозита, ед. валюты | Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 | 3 000 | Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Белорусские рубли** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 1 000 000 | 36,50 | 37,80 | 38,10 | 38,40 | 38,60 | 39,00 | 40,50 | 9,00 | 9,50 | 10,00 | 10,50 | 11,00 | 11,50 |
| 1 000 001 – 10 000 000 | 36,60 | 37,90 | 38,20 | 38,50 | 38,80 | 39,50 | 41,00 | 9,25 | 9,75 | 10,25 | 10,75 | 11,25 | 11,75 |
| 10 000 001 и более | 36,70 | 38,00 | 38,30 | 38,60 | 39,00 | 40,00 | 41,50 | 9,50 | 10,00 | 10,50 | 11,00 | 11,50 | 12,00 |
| **Доллары США** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 500 | 5,80 | 6,10 | 6,40 | 6,60 | 7,10 | 7,40 | 7,70 | 3,00 | 3,80 | 4,40 | 4,80 | 5,20 | 5,60 |
| 501 – 5 000 | 5,90 | 6,20 | 6,45 | 6,70 | 7,20 | 7,45 | 7,80 | 3,30 | 4,00 | 4,60 | 5,00 | 5,40 | 5,80 |
| 5 001 и более | 6,00 | 6,30 | 6,50 | 7,00 | 7,30 | 7,50 | 8,00 | 3,60 | 4,20 | 4,80 | 5,20 | 5,60 | 6,00 |
| **Евро** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 500 | 5,80 | 6,10 | 6,40 | 6,60 | 7,10 | 7,40 | 7,70 | 3,00 | 3,80 | 4,40 | 4,80 | 5,20 | 5,60 |
| 501 – 5 000 | 5,90 | 6,20 | 6,45 | 6,70 | 7,20 | 7,45 | 7,80 | 3,30 | 4,00 | 4,60 | 5,00 | 5,40 | 5,80 |
| 5 001 и более | 6,00 | 6,30 | 6,50 | 7,00 | 7,30 | 7,50 | 8,00 | 3,60 | 4,20 | 4,80 | 5,20 | 5,60 | 6,00 |
| **Российские рубли** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 7,30 | 7,60 | 7,90 | 8,10 | 8,60 | 8,90 | 9,20 | 4,50 | 5,30 | 5,90 | 6,30 | 6,70 | 7,10 |
| 15 001 – 150 000 | 7,40 | 7,70 | 7,95 | 8,20 | 8,70 | 8,95 | 9,30 | 4,80 | 5,50 | 6,10 | 6,50 | 6,90 | 7,30 |
| 150 001 и более | 7,50 | 7,80 | 8,00 | 8,50 | 8,80 | 9,00 | 9,50 | 5,10 | 5,70 | 6,30 | 6,70 | 7,10 | 7,50 |

Подробные условия вклада «Линия роста» в газетах: «Советская Белоруссия» № 49 от 16.03.2006, «Звязда» № 50 от 04.03.2006, на сайте банка в сети Интернет – www.belapb.by и в офисах ОАО «Белагропромбанк».
Информация о размере процентов, выплаченных по привлеченным средствам физических лиц в течение последнего финансового года, – в офисах и на сайте банка.
Полная сохранность и возврат денежных средств физических лиц, размещенных в ОАО «Белагропромбанк», гарантируются государством и осуществляются в соответствии с законодательством РБ.
Сведения о выплаченных процентах по привлеченным средствам физических лиц в 2011 году в эквиваленте, тыс. бел. руб.:

| Месяц | Январь | Февраль | Март | Апрель | Май | Июнь | Июль | Август | Сентябрь | Октябрь | Ноябрь | Декабрь | Итого |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Срочные вклады (депозиты) | 22 234 491,5 | 21 082 010,7 | 24 094 197,7 | 21 881 024,9 | 28 528 475,2 | 29 862 299,1 | 33 531 351,6 | 42 248 772,8 | 46 572 720,4 | 70 688 015,9 | 79 524 635,1 | 89 767 167,6 | 510 015 162,5 |
| До востребования | 274 941,9 | 271 945,1 | 318 622,7 | 280 118,3 | 332 210,3 | 304 192,9 | 426 672,3 | 561 679,4 | 692 478,8 | 1 012 294,2 | 1 339 616,8 | 1 931 186,7 | 7 745 959,4 |

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

**Управляющий в производстве по делу о банкротстве ОДО «Террастройпроект-плюс» г. Мозырь**
**ПРОВОДИТ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ ПРОИЗВОДСТВЕННОЙ БАЗЫ по ул. Фрунзе, 61 в г. Мозыре Гомельской области ОДНИМ ЛОТОМ**

| Состав лота | Характеристика объекта |
|---|---|
| Производственное здание со складскими помещениями и котельной | Одноэтажное, кирпичное общей площадью 239 м.кв. |
| Здание складских помещений | Одноэтажное, кирпичное, общей площадью 145 м.кв. |
| Административное здание | Одноэтажное, каркасно-засыпное, общей площадью 164 м.кв. |
| Здание гаража на два бокса | Одноэтажное, кирпичное, общей площадью 67 м.кв. |
| Здание проходной | Одноэтажное, кирпичное, общей площадью 8 м.кв. |
| Ограждение с воротами | Деревянное, ж/б столбы, металлические ворота, протяженность 151 м.п. |
| Асфальтовое покрытие | Площадь 648 м.кв. |
| Туалет дощатый | |

Территориальная зона – зона жилой усадебной застройки в центре города.

Площадь земельного участка – 0,3242 га.

Транспортная инфраструктура – городские дороги с твердым покрытием.

Инженерная инфраструктура – все инженерные коммуникации.

Организатор торгов: управляющий.

Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий.

Начальная цена торгов – 315.000.000 рублей.

Шаг аукциона 5-10%.

Сумма залога: 25.000.000 рублей на р/с № 3012410630013 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 401 г. Мозырь, БИК 153001749, получатель ОДО «Террастройпроект-плюс», УНП 490322936.

Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие только одним участником, возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Форма, порядок оплаты: одноразовый безналичный платеж на расчетный счет продавца.

Документы, предоставляемые для участия в торгах: заявление на участие, копии платежных документов, подтверждающих внесение залога, копию устава, доверенность представителю юридического лица, паспорт физическому лицу.

**Торги состоятся 30 октября 2012 года в 11.00 по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, пер. 1-ый Интернациональный, д. 27.**

**Заявки принимаются до 12.00 29 октября 2012 года по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, пер. 1-ый Интернациональный, д. 27.**

**Справки по телефону: 8-029-663-84-96.**

**Управляющий в производстве по делу о банкротстве**
**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ДЕБИТОРСКОЙ ЗАДОЛЖЕННОСТИ ОДО «Террастройпроект-плюс» г. Мозырь**

| № лота | Наименование дебитора | Сумма задолженности (руб.) | Стартовая цена (руб.) | Сумма залога (руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Ачаповский Константин Семенович, г. Мозырь, ул. Нагорная, 41 | 167 756 369 | 150 980 732 | 12 000 000 |
| 2. | Ачаповский Константин Семенович, г. Мозырь, ул. Нагорная, 41 | 71 264 805 | 64 138 325 | 6 000 000 |
| 3. | Сергеев Сергей Валерьевич, г. Мозырь, ул. Малинина, д.19, кв. 24 | 27 025 291 | 24 322 762 | 2 400 000 |
| 4. | Мирошниченко Юрий Анатольевич, г. Мозырь, ул. Гагарина, д. 32, кв. 33 | 7 559 596 | 6 803 636 | 680 000 |

Организатор торгов: управляющий.

Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий.

Сумма залога: до 10% от начальной цены на р/с № 3012410630013 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 401 г. Мозырь, БИК 153001749, получатель ОДО «Террастройпроект-плюс», УНП 490322936.

Шаг аукциона 5–10%.

Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Форма, порядок оплаты: одноразовый безналичный платеж на счет продавца.

В случае признания торгов не состоявшимися, в связи с подачей заявления на участие только одним участником, возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Документы, предоставляемые для участия в торгах: заявление на участие, копии платежных документов, подтверждающих внесение залога, копию устава, доверенность представителю юридического лица, паспорт физическому лицу.

**Торги состоятся 13 ноября 2012 года в 12.00 по адресу: г. Мозырь, пер. 1-ый Интернациональный, 27.**

**Заявки принимаются до 12.00 12 ноября 2012 года по адресу: г. Мозырь, пер. 1-ый Интернациональный, 27.**

**Справки по телефону: 8-029-663-84-96.**

**г. ВИТЕБСК** **13.11.2012**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ СНИЖЕНА НА 50%

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи объекта аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 6. | Капитальное строение, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, Адамовский с/с, вблизи дер. Струбки | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 250/С-34878 (высоковольтный кабель «ААБ-3х95»). | **127 685 622** | **12 768 560** |

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

**Аукцион состоится 13.11.2012 в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

1. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 12.11.2012 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 13.11.2012 с 14.00 до 15.00.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет **№ 3642903027026** в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. **Участник, ставший победителем аукциона (претендент на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона, в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, не позднее семи рабочих дней со дня проведения аукциона подписать договор купли-продажи объекта.

4. Информация об аукционе, условиях продажи, участия в торгах опубликована ранее в газете «Звязда» № 80 (27195) от 26.04.2012, от 29.08.2012 № 166 (27281).

## САМАБЫТНАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА — АДЗІН З КРАЕВУГОЛЬНЫХ КАМЯНЁЎ У ФУНДАМЕНЦЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Аб гэтым гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, зачытаным учора ў Нясвіжы на ўрачыстай цырымоніі з нагоды святкавання Дня работнікаў культуры, перадае **БЕЛТА**.

«Самабытная нацыянальная культура з'яўляецца адным з краевугольных камянёў у фундаменце беларускай дзяржаўнасці, той неадольнай сілай, якая аб'ядноўвае ўсіх нас і напаўняе сэнсам і любоў да велічнай і прыгожай Айчыны», — гаворыцца ў віншаванні. «Мы ганарымся вашымі дасягненнямі і заўсёды будзем падтрымліваць тых, хто сваім талентам і майстэрствам уносіць значны ўклад у задавальненне духоўных патрэбнасцяў грамадства, ствараючы шэдэўры, дастойныя нашага часу», — гаворыцца ў звароце да работнікаў сферы культуры.

Работнікі сферы культуры ўзнагароджаны за значны ўклад у развіццё культуры, адраджэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў уручыў узнагароды Адміністрацыі Прэзідэнта, міністр культуры Павел Латушка — Савета Міністраў і Міністэрства культуры.

Міхась ДРЫНЕЎСКІ:

## «ФЕСТЫВАЛЮ ЖЫЦЬ, РАЗВІВАЦЦА, РАДАВАЦЬ»

**ЮБІЛЕЙНЫ 10-ы фестываль «Напеў зямлі маёй» адбыўся ў Мар'інай Горцы. Лепшыя калектывы не толькі адзначаны дыпломамі, але і ўзнагароджаны каштоўнымі падарункамі, якія будуць спрыяць далейшаму ўвасабленню народнай творчасці ў мастацтве калектываў Мінскай вобласці.**

Сёлета гран-пры атрымаў узорны ансамбль народнай песні «Дзянніца» Клецкай ДШМ пад кіраўніцтвам Вольгі Нупрэйчык. Ён выканаў вакальна-харэаграфічную дзею з музычнымі старонкамі. Узнагародай для ўладальнікаў гран-пры стаў мікрааўтобус «Газель», які пераможцам падарыў Мінскі аблвыканкам.

Лаўрэаты вызначаліся ў чатырох намінацыях. Узнагарода «За высокі ўзровень выканальніцкага мастацтва і прапаганду нацыянальнай інструментальнай музыкі» засталася дома — яе атрымаў мар'інагорскі народны ансамбль народных інструментаў «Крыніца» пад кіраўніцтвам Андрэя Федзянкова. За захаванне і развіццё фальклорных традыцый рэгіёна ўзнагароджаны аўтэнтычны фальклорны калектыў «Глыбокія крыніцы» з Любанскага раёна пад кіраўніцтвам Надзеі Мірэйчык. У намінацыі «За ўвасабленне беларускай танцавальнай культуры ў аматарскім харэаграфічным мастацтве» адзначаны народны харэаграфічны ансамбль «Сузор'е» Палаца культуры з Салігорска (кіраўнік — Вадзім Матанцаў). Лаўрэатам у намінацыі «За высокі ўзровень выканальніцкага майстэрства і вялікі ўклад у развіццё беларускай песеннай культуры» стала народная студыя эстраднай песні «Апрель» Дзяржынскага ГДК пад кіраўніцтвам Наталлі Хрыстафоравай.

Варта адзначыць, што прызы пераможцам гэтага фестывалю ўручаліся надзвычай каштоўныя. У якасці ўзнагарод калектывы атрымалі камп'ютары для студыі гуказапісу, музычныя інструменты, гукаўзмацняльную апаратуру, канцэртныя мікрафоны і г.д.

Прафесійнае журы ўзначальваў кампазітар, народны артыст Савецкага Саюза, старшыня Беларускага саюза кампазітараў, прафесар Ігар Лучанок. 10 гадоў таму менавіта па яго ініцыятыве быў распачаты гэты фестываль народнай творчасці. Сустаршынёй журы быў мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя. Г.І.Цітовіча, народны артыст Беларусі, старшыня Беларускага саюза музычных дзеячаў, прафесар Міхаіл Дрынеўскі. Міхаіл Паўлавіч так апісаў свае ўражанні ад імпрэзы:

— Як заўсёды, фестываль пачынаецца з крокаў не вельмі ўпэўненых, але з кожным годам ён мацнее, прыгажэе. Так адбылося і на гэтым юбілейным, 10-м фэсце ў Мар'інай Горцы. Ён стаў апагеем творчасці. Па-першае, былі прадстаўлены ўсе раёны Мінскай вобласці. Па-другое, мы былі па-добраму здзіўлены, калі на сцэну выходзілі фальклорныя калектывы, у якіх удзельнікам па 80, 85 гадоў, і яны так цудоўна паказвалі даўніну, уражвалі вакальным мастацтвам. Сярод такіх выступоўцаў адны́мі з самых адметных былі бабулі і дзяды з Любані. Патрэціе, было шмат дзіцячых калектываў. Яны спявалі з такім народным каларытам, з выдатным адчуваннем народнай творчасці. Дзіцячы калектыў з Клецка выкарыстаў у сваім нумары столькі фантазіі, столькі пачуццяў, што проста на слязу прабівала. Таму мы адзінагалосна прысудзілі ім гран-пры. Фестываль моцна ўразіў сваёй рознакаляровасцю, рознаўзроставасцю. Я ўпэўнены, што яму наканавана жыць, развівацца, радаваць. У «Напеве зямлі маёй» нічога не было чужароднага — усё па поклічы душы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

■ Экслібрыс «Звязды»

## КАНВАЛЮТ ДЛЯ БІБЛІЯФІЛА



**Міхась КАЗЛОЎСКІ. «Да кніжных скарбаў дакрануся...». Нататкі. «Літаратура і мастацтва», 2011.**

Патэнцыйных чытачоў заваблівають тэлебачанне і інтэрнэт, ладзяцца акцыі для падтрымкі чытання, сеціва поўніцца моладзевым крэатывам: тыя, хто чытае кнігі, кіруюць тымі, хто глядзіць тэлевізар; чытаць — гэта сэксуальна; не хадзі на спатканні да чалавека, у якога няма дома кніг; той, хто любіць кнігі, ніколі не кладзецца ў ложак адзін і г.д.

Можна паставіцца да такіх спроб папулярызацыі чытання з іроніяй, а можна прызнаць, што любоў да кніг можа сягаць таго шаленства, калі чытанне становіцца вельмі інтымным перажываннем: «старая кніга рассоўвае межы часу, набліжае эпоху любімага пісьменніка, робіць аўтара больш блізкім, родным і зразумелым <...>. Баюся, яму, таму крытыку, ніколі не зразумець хвалюючай радасці і трапяткога пачуцця адзінства паміж чытачом і аўтарам, калі застаешся са старой кнігай сам-насам».

Бібліяфіл і краязнавец Міхась Казлоўскі дзеліцца ў кнізе працяглай гісторыяй сваёй любові да кніг, калі адлегласці і кепскае надвор'е не перашкода для апантанага чалавека. Апісаныя экслібрысы (кніжны знак, на якім пазначана імя ўладальніка і змешчаны малюнак ці герб), канвалюты (зборнікі, уклочаныя ў агульны пераплёт на жаданні ўладальніка бібліятэкі з прычыны агульнай тэматыкі альбо для маскіроўкі забароненых выданняў), ілюстрацыі, старыя кнігі і часопісы падаюцца аўтарам як аб'екты ўнікальныя, але без залішняга пафасу. Гэта і зразумела: можна заклікаць чытаць кнігі, але, напрыклад, немагчыма (ды і не трэба) прымушаць збіраць беларускія выданні літоўскага Коўна.

Кожная кніга, малюнак ці надпіс у ёй становяцца ключом да біяграфій дзясяткаў людзей і важнай дэталлю айчыннай гісторыі: хто спрыяў выданню, за чые грошы ажыццявілася, хто згенераваў ідэю, хто напісаў, хто зрабіў ілюстрацыі, хто збярог да нашага часу. І што з гэтымі людзьмі было потым. Пры такім падыходзе любая даўняя кніга становіцца ўвасабленнем гісторыі краіны.

Міхась Казлоўскі распавёў не толькі гісторыю беларускага кнігавыдання, але і гісторыю беларускага бібліяфільства. Кніга поўніцца аповедамі пра ўнікальных людзей, якія жывуць недзе побач, аточаныя старымі выданнямі, гатовыя пра іх разважаць гадзінамі. Міжрадковым пасланнем становіцца ўсведамленне вялікасці і духоўнай сілы: былі тыя таленты, што стварылі артэфакты культуры, і ёсць тыя захавальнікі, якія не патрабуюць нічога, абы толькі ім не перашкаджалі.

Простыя побытавыя дэталі сёння могуць здавацца дзіўнымі: аўтар расказаў, як прыехаў у госці, як пакармілі, як дазволілі пакорпацца ў багатай бібліятэцы і нават падарылі нешта з падвойных асобнікаў, спаць пасцялілі, каб раніцай працягнуць размову пра кнігі. Такія эпізоды паказваюць, што бібліяфільства — лад жыцця, які немагчыма імітаваць.

Відавочна, камунікуючы з такімі людзьмі, часам значна старэйшымі за яго, атрымлівае ад іх у падарунак каштоўныя ва ўсіх сэнсах выданні, аўтар пачынае ставіцца да іх безумоўна, схіляючыся перад іх аўтарытэтам. Што апраўдана ў большасці выпадкаў, але мяне як чытача гэтай кнігі перасмыкнула ад пытання пляменніцы Якуба Коласа, якая жыла ў Штутгарце: «Як вы дапусцілі, што з мовай такое робіцца?» Я прызнаю суб'ектыўнасць свайго меркавання, але мне здаецца, што ёсць пытанні, якія з эміграцыі задаваць не варта.

Апавядаючы пра рэдкія кнігі, аўтар усведамляе элітарнасць асяродку, да якога належыць. І гэтыя нататкі бібліяфіла, апісанні і экскурсы ў гісторыю робяць тое, што найбольш цяпер патрэбна нашай культуры.

У верасні ва ўніверсітэце Марыі Складоўскай-Кюры ў Любліне была беларуска-польская канферэнцыя, дзе сярод іншага казалі, што беларусы часам ныюць, маўляў, у нас нічога няма, а ў нас няма толькі якаснага менеджменту, рэкламы таго багацця, якое мы маем.

Часам патрабуецца агрэсіўная прамоцыя, каб у свядомасці шараговых грамадзян адклаўся сам факт наяўнасці культурных каштоўнасцяў, тых, што захаваліся, перажылі ўсе страшныя падзеі, гістарычныя і прыватныя. Бо кнігі баяцца не толькі вогнішча гісторыі, але і смерці ўладальніка прыватнай бібліятэкі і абыякавасці яго нашчадкаў.

Бібліяфільства не хочацца называць звычайным калекцыянаваннем. Гэта місія, нават пакліканне. Тады разумееш: калі не я, то хто? І вось бібліяфіл з Маладзечна гатовы гадзінамі трэсціся ў аўтобусах, каб даехаць да далёкай вёскі, дзе можа быць каштоўная кніга, гатовы з замежжа весці торбамі беларускія кнігі, выдадзеныя там ці захаваныя з пачатку стагоддзя. І растлумачыць сваю зацятасць цяжка: «Не ведаю, чаму гэта сціплае, больш чым 80-гадовай даўнасці выданне мне падабаецца. Але не толькі за тое, што люблю збіраць старыя беларускія кнігі і часопісы. Нешта ёсць у такіх выданнях магічнае і чароўнае, глыбіннае і цяжка вытлумачальнае з пункту гледжання звычайнай чалавечай логікі. Калі сам дух часу, яго прысутнасць нараджае ў душы той настальгічны сантымент, тое шчырае замілаванне і любоў да лёсавызначальных і бурапенных дваццатых гадоў».

**Аксана БЯЗЛЕПКІНА** ■

# НЕ ПЛАКАЦЬ ПА ПОМНІКАХ

## У вёсцы Глуша будзе створаны музей пісьменніка Алеся Адамовіча

Пра гэта паведаміў старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў Антон Астаповіч. Месцам стварэння музея абрана вёска і хата, дзе развівалася партызанская гісторыя, якая сфарміравала антыфашысцкі і антываенны светапогляд пісьменніка, апісаная потым у яго творах. Разам з дачкой Алеся Адамовіча Таварыства аховы помнікаў здолела дасягнуць дамоўленасцяў з мясцовым кіраўніцтвам. Прынята ўжо юрыдычнае рашэнне Магілёўскім аблвыканкамам і Бабруйскім райвыканкамам: музей павінен быць заснаваны з наступнага года, у ім прадугледжваюцца дзве штатныя адзінкі. Падрыхтаваны ўсе дакументы па арганізацыі дабрачыннага рахунку, які будзе адкрыты пры Глушанскім пасялковым савеце для збору сродкаў на гэты музей, таму што адных бюджэтных сродкаў для ўвасаблення гэтай задумы не хопіць. Такім чынам само грамадства можа зрабіць унёсак у захаванне беларускай памяці і гісторыі.

— Я пастаянна крытыкую нашу грамадскасць, якая вельмі часта плача па помніках, палец аб палец не ўдарыць, каб помніку дапамагчы, — разважае Антон Астаповіч. — Для гэтага можна было б зрабіць першы крок — элементарную прапанову на наданне статусу помніка гісторыка-культурнай спадчыны. Калі няма такога статусу, то аб'ект цяжэй захаваць... Падчас нашай апошняй экспедыцыі мы праязджалі вёску Голдава, паглядзелі драўляную царкву, якая пад аховай дзяржавы. А за 300 метраў ад царквы стаяў цудоўны сядзібны дом канца XIX стагоддзя. Там была дзіцячая ўстанова, будынак жыў. Цяпер пайшлі глядзець сядзібны драўляны дом — ад яго адзін падмурак. Вось для чаго гэта трэба. Імкліва знікаюць аб'екты. Такім чынам у Глыбокім знікла міква — яе зруйнавалі, таму што глыбокія краязнаўцы не падавалі своечасова прапанову па ёй у дзяржаўны спіс. Трэба надаваць статус аб'ектам, інакш мы іх страчваем.

Таму Таварыства аховы помнікаў само гатова паказваць прыклад грамадскасці і краязнаўцам: падае свае прапановы ў Міністэрства культуры, каб пэўным аб'ектам, якія пакуль не ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў, надавалі такі статус.

Тым больш што на Усебеларускім народным сходзе была прынятая праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011-2015 гады, адным з пунтаў якой быў і такі: пашырэнне дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцяў. За 5 гадоў дзяржаўны спіс павінен быць пашыраны на 5000 матэрыяльных аб'ектаў — у сярэднім 1000 на год.

— Дзяржспіс папаўняецца, але нарматыўныя лічбы не выконваюцца. Таму Беларускае таварыства аховы помнікаў вырашыла па выніках сваіх экспедыцый, калі ідзе выяўленне аб'ектаў матэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны (архітэктура, рухомыя аб'екты), падаваць прапановы на наданне ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. У пачатку верасня таварыства прапанавала на разгляд Мінкульта прапановы па 37 аб'ектах рухомай матэрыяльнай спадчыны (рухомы састаў, які захоўваецца ў Брэсцкім дэпо) і 19 аб'ектаў архітэктуры ў рэгіёнах Беларусі. Адзін квартал у горадзе Мінску, які абмежаваны вуліцамі Багдановіча, Кісялёва, Куйбышава, Камуністычнай (у народзе завецца Асмалоўка) — гэта першы пасляваенны спальны раён у Мінску, пабудаваны па тыпавым праекце, які распрацоўваў архітэктар Асмалоўскі. Яшчэ адзін цікавы аб'ект — рэшткі сінагогі ў вёсцы Новы Свержань. Гэта не толькі адзін з тых матэрыяльных аб'ектаў яўрэйскай культуры, якія знікаюць, але яшчэ і помнік горадабудаўніцтва: сінагога разам з касцёлам і царквой утрымліваюць планіровачную структуру. На жаль, зацікаўленасці ў іх мы не адчулі... Гэта ставяць пад сумнеў выкананне палажэнняў дзяржаўнай праграмы.

Кіраўнік Беларускага таварыства аховы помнікаў адзначыў, што супрацоўніцтва з Міністэрствам культуры ішло плённа, калі распрацоўваліся змены і дапаўненні ў закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны». Міністэрства культуры заўсёды рэагуе на лісты таварыства аб парушэнні заканадаўства: практычна заўсёды высылае праверку, складаюцца адміністрацыйныя пратаколы, парушальнікі штрафуюцца.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**




Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Гармата. Бяроза. Гурт. Кола. Акт. Здор. Вярба. Клён. Ляда. Бак. Міска. Рэклама. Гар. Ака. Рана. Марс. Пірат. Капітан. Гуно. Аліса. Нара. Калаж. Базар. Сага. Прысуд. Кіпу. Будан. Габардзін.

**Па вертыкалі:** Меркурый. Пук. Вёска. Міна. Арол. Багара. Алупка. Драма. Стаж. Арго. Карэ. Стык. Улар. Зіма. Сіг. Бурак. Група. Туя. Каза. Дуб. Вампір. Асіна. Растан. Таз. Кашара. Контратака. Наркаман.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.30 | 18.21 | 10.51 |
| Віцебск — | 7.22 | 18.09 | 10.47 |
| Магілёў — | 7.21 | 18.11 | 10.50 |
| Гомель — | 7.15 | 18.10 | 10.55 |
| Гродна — | 7.45 | 18.36 | 10.51 |
| Брэст — | 7.44 | 18.39 | 10.55 |

## Месяц

***Апошняя квадра 8 кастрычніка. Месяц у сузор'і Дзевы.***

## Імяніны

***Пр.*** *Марыі, Ульяны, Аляксея, Анатоля, Мікалая, Рыгора, Фёдара.* ***К.*** *Альдоны, Аляксандра, Вальдэмара, Эміля.*

# ЗАЎТРА




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Даты | Падзеі | Людзі

**1811** год — нарадзіўся (маёнтак Шчорсы, зараз Навагрудскі раён) Антон Юзаф Глінскі, беларускі фалькларыст, пісьменнік. Працаваў у бібліятэцы Храптовічаў. З 1844 года жыў у Вільні, дзе рэдагаваў «Виленские губернские ведомости». З 1863 года быў перакладчыкам у газеце «Виленский вестник». Аўтар «Польскага казачніка» — зборніка апрацаваных беларускіх народных казак, анекдотаў, апавяданняў. Памёр у 1866 годзе.



**1931** год — у гэты дзень да Максіма Горкага прыйшлі важныя госці: Іосіф Сталін, Вячаслаў Молатаў і Клім Варашылаў. Пісьменнік прачытаў ім сваю вершаваную казку «Дзяўчына і смерць». «Гэтая штука будзе больш моцнай, чым «Фауст» Гётэ — каханне перамагае смерць», — сказаў Сталін. Горкі не пярэчыў супраць такой ацэнкі. Доўгія гады потым гэты водгук «правадыра народаў» цытаваўся і славіўся за мудрасць і дакладнасць. А майстар сацрэалізму Яр-Краўчанка нават напісаў карціну, якую так і назваў: «Горкі чытае 11 кастрычніка 1931 года Сталіну, Молатаву і Варашылаву сваю казку «Дзяўчына і смерць».

**1933** год — нарадзіўся Мікалай Анатольевіч Мальцаў, беларускі вучоны і канструктар ў галіне вылічальнай тэхнікі. З 1960 года на Мінскім заводзе ЭВМ, у 1972-96 гадах у НДІ ЭВМ. Аўтар навуковых прац і вынаходніцтваў па ЭВМ тыпу «Мінск» і Адзінай сістэмы вылічальных комплексаў, сістэм і сетак. Адзін з вядучых распрацоўшчыкаў ЭВМ «Мінск-2», «Мінск-23». Галоўны канструктар машыны «Мінск-26», працэсара ЭВМ ЕС-1020; намеснік галоўнага канструктара машыны «Мінск-27» і ЭВМ ЕС-1022. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1970).

## Было сказана

**Ян ПРАТАСОВІЧ (другая палова XVI ст. — пасля 1608), паэт і перакладчык:**

***«Вось ты бачыш прыгожы свой адбітак твару, то зрабі, каб душа з ім утварыла пару».***

■ Здарэнне

## ХАЛАДЗІЛЬНІК — ПРЫЧЫНА... ЭВАКУАЦЫІ

**У Чашніках у шматпавярховым жылым доме ў адной з кватэр з-за кароткага замыкання ў халадзільніку адбыўся пажар.**

— А 10 гадзіне раніцы гарэла кватэра ў райцэнтры на завулку Ленінскі. Выратавальнікамі была выведзена з задымленай зоны гаспадыня кватэры і перададзена брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі, — расказалі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — З атручэннем прадуктамі гарэння жанчына была дастаўлена ў Чашніцкую цэнтральную раённую бальніцу. З кватэр, размешчаных на ніжэйшых паверхах, па лесвічным маршы эвакуявалі 9 чалавек, пацярпелых няма. Прычына пажару — парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання (кароткае замыканне ў халадзільніку).

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

## УСМІХНЕМСЯ

**У 500 жанчын спыталі: чый пацалунак саладзейшы, мужа ці палюбоўніка? 300 адказалі, што мужа, а 200 жанчын адказалі, што палюбоўніка. Але ніводная не адказала «Не ведаю».**

У антыкварнай краме.
— Я хацеў бы купіць вунь тую мумію.
— Прабачце, яна не прадаецца.
— Чаму?
— Гэта гаспадар крамы.

**У Карэі на плоце вакол дома пішуць: «Асцярожна, злы і нясмачны сабака!».**

Муж злавіў палюбоўніка на месцы злачынства і б'е яго. Жонка ў роспачы крычыць:
— Што ж ты робіш, Вася?! Гэта ж бацька тваіх дзяцей!



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.149. Індэкс 63850. Зак. № 4632.

Нумар падпісаны ў 19.30 10 кастрычніка 2012 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12